ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(Па дармовым дадатках „Прафрух")

На 1 мес.	50 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбаўку.

Эпл. Москва, Библиотека ВОКС СССР

ПРОЛЕТАРЫ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

АЎТОРАК 27 мая 1930 г. № 122 (3720) Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

НА АСНОВЕ БАЛЬШАВІЦКАГА АДЗІНСТВА

Амаль усюды канчаюцца акруговыя партыйныя канфэрэнцыі. Усюды скончана абмеркаваньне дакладаў Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б і спрэчкі па іх. Усе канфэрэнцыі прынялі рэзалюцыі па дакладах ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Ужо зараз можна падвесьці некаторыя агульныя палітычныя вынікі тым спрэчкам, якія разгарнуліся па справаздачы Цэнтральнага Камітэту нашай партыі. І тон ацэнцы, якую далі акруговыя партыйныя канфэрэнцыі дзейнасьці ЦК за мінулы ад XII зьезду КП(б)Б пэрыяд.

За пэрыяд ад XV зьезду УсеКП(б) і XII зьезду КП(б)Б наша беларуская арганізацыя, як частка УсеКП(б), вытрымала цэлы рад буйных баёў за генэральную лінію партыі супроць атак па гэтую лінію справа і «зьлева». Наша арганізацыя рашуча змагалася з рэшткамі контр - рэвалюцыйнага трацкізму, з рэцыдывамі трацкісцкіх настрояў, з «левымі» загібамі, з «левымі» тэндэнцыямі. За гэты пэрыяд наша партыя з посьпехам правяла барацьбу з атакамі на лінію партыі з боку правай апазыцыі, зьвязаўшы барацьбу супроць правай небясьпекі, як галоўнай небясьпекі, з выкрыцьцём не канкрэтных праяўленьняў на практыцы работы асобных зьвеньняў нашай партыі.

Наперакор сумным прадраканьням правых апартуністых, наперакор трацкісцкім крыкам аб «тэрмідарыянскім пераражджэньні» нашай партыі, крыкам, якія, да рэчы сказаць, зараз па важнейшых пытаньнях партыйнай палітыкі зьліліся з праваапартуністычнымі тэорыямі і поглядамі — партыя дабілася буйнейшых посьпехаў на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва і правільна кіравала і мабілізавала навкола сваіх лёзунгаў шырокія масы рабочае клясы і бядняцка - серадняцкага сялянства Беларусі.

Разглядаючы і ацэньваючы ўвесь пэрыяд барацьбы ад XII зьезду КП(б)Б за лінію партыі, нельга не адзначыць (і гэта выразна падкрэсьлілі ўсе акруговыя партканфэрэнцыі), што наша партыя, пад кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту, правяла вялікую барацьбу супроць нацыянал - апартунізму ў сваіх радох і яго канкрэтных посьбітаў. Як адначалі гэта т. Гей — у сваёй прамове на фрунзаўскай канфэрэнцыі і тав. Васілевіч — у сваім апошнім артыкуле — «КП(б)Б ў барацьбе за бальшавіцкую лінію партыі», характэрнай рысай для Беларусі зьяўлялася і зьяўляецца сплятаньне паміж нацыянал-апартунізмам і апартунізмам у агульных пытаньнях партыйнай палітыкі. Гэтае сплятаньне мы бачылі і ў «прыцьвяўпучніце», гэтае сплятаньне мы бачылі і ў памылках нац.-апартуністых. Зусім відавочна, што партыя наша мабілізавала ўвагу сваіх арганізацый для рашучага выкрыцьця нацыянал - апартуністычнага ўхілу і сьмелай і непрымірымай барацьбы з правямі гэтага ўхілу, як у тэорыі, так і на практыцы.

Менская, Віцебская, Гомельская, Бабруйская і ўсе іншыя акруговыя партыйныя канфэрэнцыі з выключнай адналушнасьцю **цалкам і поўнасьцю прызналі палітычную і арганізацыйную лінію ЦК КП(б)Б за пэрыяд ад XII да XIII зьезду правільнай.** Усе партыйныя канфэрэнцыі з выключнай аднадушнасьцю прызналі правільнай генэральную лінію нашай партыі, якая жыцьцяўлясьцца пад кіраўніцтвам бальшавіцкага, ленінскага ЦК УсеКП(б). Мы можам сьмела сказаць, што рашучая маса нашай арганізацыі згуртаваўшы радамі стаіць наўкола лініі партыі і яе бальшавіцкага кіраўніцтва.

Усе акруговыя партыйныя канфэрэнцыі ясна падкрэсьлілі, што посьпехі, якія мы масм у галіне будаўніцтва Сацыялістычнай Беларусі, былі магчымы толькі ва ўмовах самай бязьлітаснай і зашчыльнай барацьбы, якую вяла наша партыя пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту за чыстату лініі партыі, супроць рэвізіі гэтай лініі, супроць наскокаў на яе.

Усюды, пры абмеркаваньні справаздач Цэнтральнага Камітэту, разгарнуліся надзвычай акжыўленыя спрэчкі, якія праходзілі **пад знакам бальшавіцкай самакрытыкі і крытыкі тых паасобных памылак і тых недахопаў, якія меліся ў рабоце Цэнтральнага Камітэту.** Асабліва актыўна былі абмеркаваны пытаньні калгаснага руху. Партыйныя канфэрэнцыі прызналі, што ў практыцы калгаснага будаўніцтва на Беларусі былі дапушчаны скажэньні партыйнай лініі і што іменна гэтыя скажэньні зьявіліся асноўнай прычынай тых частковых адліваў з калгасаў, якія мы мелі ў рэспубліцы. Канфэрэнцыі выкрывалі гэтыя памылкі і перагібы, і канстатавалі, што нашы арганізацыі ў асноўным перабудавалі свае рады і разгарнулі шырокую працу па арганізацыйна - практычным замацаваньні калгасаў.

Канфэрэнцыі прызналі, што **палітычная лінія ЦК КП(б)Б у пытаньнях калектывізацыі зьяўлялася правільнай і што ЦК па-бальшавіцку прызнаў тыя паасобныя памылкі, якія меліся ў яго ў галіне калгаснага руху.** Гомельская партканфэрэнцыя адзначыла, што «ЦК КП(б)Б сваёй пастановай ад 17-га красавіка 1930 году, выкрываючы паасобныя памылкі, дапушчаныя з боку ЦК, для ўсёй КП(б)Б наказаў яскравы прыклад бальшавіцкай самакрытыкі і правільнай барацьбы за генэральную лінію партыі, гэтым самым яшчэ больш мабілізаваў усю КП(б)Б на выпраўленьне дапушчаных памылак у справе калектывізацыі».

Адзначаючы аднадушша нашай партыі ў барацьбе за генэральную лінію, нельга не адзначыць тых **паасобных спроб** наскокаў на лінію партыі, якія мы мелі на партканфэрэнцыях як пры абгаварэньні справаздач ЦК, так і пры спрэчках па справаздачах паасобных акруговых камітэтаў.

Мы ўжо ня раз адзначалі, што цяпер адбываецца бязумоўнае новае ажыўленьне права і «лева»-апартуністычных элемэнтаў унутры нашай партыі. Гэтыя элемэнты выкарыстоўваюць памылкі і скажэньні лініі партыі, якія меліся на месцах у калгасным будаўніцтве, на ЦК КП(б)Б, а далей і на ЦК УсеКП(б); спроб вытлумачыць памылкі — агульнай палітычнай лініяй партыі; спроб рэвізаваць правільнасьць нашай лініі на баявым тэмпы індустрыялізацыі краю, на калектывізацыю на падставе добраахвотнасьці і шырокага масавага руху бядняцка-серадняцкіх мас; спроб «левых» загібістых упарта адстойваць сваё галавацтва і нежаданьне прызнаваць да канца памылкі.

На гэтых вылазках з усёй выразнасьцю і яскравасьцю выступіў той факт, як правыя і «левыя» ў сумеснай барацьбе супроць лініі партыі робяць усё, каб дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва, каб сьцягнуць нашу партыю з ленінскага шляху. Учарашнія «левакі» сёньня крычаць аб «адступленьні» і аб'ектыўна дапамагаюць правым апартуністым у іх спробах рэвізаваць усю ўстаноўку партыі па калектывізацыі сельскай гаспадаркі і на яе базе — ліквідацыю кулацтва, як клясы. Правая небясьпека застаецца галоўнай небясьпекай для сучаснага пэрыяду, «левыя» перагібы дапамагаюць праваму апартунізму, «левыя» памылкі гарможаць пасьпяховае разьвіцьцё калгаснага руху. Барацьба на два фронты застаецца генэральнай задачай партыі і гэта выразна падкрэсьлілі акруговыя партканфэрэнцыі.

На некаторых канфэрэнцыях (Аршанская, Бабруйская) былі спробы замазаць тыя памылкі, якія рабіліся мясцовымі арганізацыямі і акруговымі кіраўніцтвамі з тым, каб усю палітычную адказнасьць за тэтыя памылкі зваліць на Цэнтральны Камітэт. Нежаданьне самакрытыкі, баязьлівасьць перад ёю — характэрная рыса для апартуністычных элемэнтаў нашай партыі. Яна выявілася і пры вылазках апартуністычных элемэнтаў на акруговых партканфэрэнцыях. Гэтыя элемэнты, хоць часамі і прыкрываліся гутаркамі аб «крытыцы», у сапраўднасьці выступалі супроць бальшавіцкай самакрытыкі, супроць разгортваньня шырокай актыўнасьці партыйных мас у справе выкрыцьця ўсіх недахопаў і памылак. Аршанская канфэрэнцыя дала рашучы адпор спробам замазаць грубыя памылкі, якія меліся ў Аршанскай АК і кваліфікавала спазьненьне з прызнаньнем памылак і адсутнасьць мабілізацыі партыйных мас вакол выпраўленьня перагібаў, як прыміраньцва да скажэньняў лініі партыі.

«Зьвязда» ў сваёй перадавой ад 19-га мая правільна ацаніла палітычны сэнс гэтых паасобных наскокаў на лінію нашай партыі. Было-б самым яўным **прыміранцтвам,** якое ня мае нічога агульнага з бальшавізмам, замазваць **палітычнае** значэньне гэтых паасобных вылазак і наскокаў апартуністычных элемэнтаў супроць партыйнай лініі і партыйнага кіраўніцтва. Было-б грубай палітычнай памылкай не надаваць палітычнага характару спробам зваліць усю віну за памылкі на Цэнтральны Камітэт і на яго лінію. Было-б грубай палітычнай памылкай ня бачыць за гэтымі спробамі простае скочваньне да рэвізіі ўсёй нашай лініі.

Усе партыйныя канфэрэнцыі далі жорсткі і аднадушны адпор вылазкам апартуністычных элемэнтаў супроць партыйнай лініі. Гомельская, Аршанская, Бабруйская і інш. канфэрэнцыі вострa ўдарылі па тых, хто хацеў абгаварэньне справаздач Цэнтральнага Камітэту павярнуць на непартыйны шлях, на шлях перагляду лініі нашай партыі. Гомельская акруговая партканфэрэнцыя ў сваёй рэзалюцыі па дакладу ЦК КП(б)Б — «заклікае ўсю партарганізацыю даць рашучы бальшавіцкі адпор правым апартуністым, «левым» загібістым, якія прабуюць пад выглядам «крытыкі» дапушчаных памылак у справе калектывізацыі рэвізаваць генэральную лінію партыі і дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва»...

Уся партыя, бязумоўна, вырасла і загартавалася ў барацьбе, якую яна вяла і вядзе на два фронты. Нашу партыю не надманіш на крыклівым і радыкальным фразэрстве, па дэмагагічных спробах пад выглядам мнімай «самакрытыкі» атакаваць лінію партыі. Партыя дала адпор на сваіх канфэрэнцыях апартуністычным элемэнтам абодвых відаў, якія прабавалі падняць галаву і павесьці барацьбу супроць ленінскай палітыкі, каторую ажыцьцяўляе партыя і яе Цэнтральны Камітэт.

Ясна, што гэта ажыўленьне апартуністычных элемэнтаў нямінуча зьвязваецца з ажыўленьнем і нацыянал-апартуністычных элемэнтаў, якія ў супольным блёку з правымі і «левымі» апартуністымі ідуць супроць партыйнай палітыкі і ўсялякімі шляхамі — скрытымі і адкрытымі — стараюцца прасоўваць свае апартуністычныя тэорыйкі і погляды.

Яўнае банкруцтва нацярпелі спробы заатакаваць лінію Цэнтральнага Камітэту нашай партыі пад выглядам атак на палітычную лінію органа ЦК КП(б)Б газэты «Зьвязда». Канфэрэнцыі з вылючнай актыўнасьцю і жвавасьцю абмяркоўвалі і абмяркоўваюць пытаньні партыйнага друку. Разгортваючы шырокую самакрытыку і крытыку, усе акруговыя партканфэрэнцыі паказвалі на тыя памылкі, якія меліся ў партыйным друку, і ў прыватнасьці ў «Зьвязьдзе» і якія ёю пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту сваячасова выпраўлены. Але адначасова канфэрэнцыі далі адпор асобным спробам вытлумачыць палітычную лінію «Зьвязды», якая была ў асноўным правільнай, як лінію няправільную. Гэтыя спробы не знайшлі шырокага водгуку ў партыйных арганізацыях. Акруговыя партканфэрэнцыі адзначылі, што «Зьвязда» выконвае і будзе выконваць тыя сур'ёзныя і важнейшыя задачы, якія стаяць перад ёю ў непрымірымай барацьбе за партыйную лінію.

Такім чынам, мы бачым, што абмеркаваньне дакладаў ЦК і ЦКК КП(б)Б выявілася ўсюды ў дэманстрацыю палітычнага адзінства нашай партыі, палітычнае ня згуртаванасьці на аснове прызнаньня правільнасьці лініі, якая праводзіцца партыяй і яе Цэнтральным Камітэтам. Яно выявілася ўсюды ў дэманстрацыю бальшавіцкай непрымірымасьці нашай беларускай арганізацыі ў барацьбе супроць наскокаў на лінію партыі і спроб яе рэвізіі. Абагачаныя вопытам канфэрэнцыі абмяркоўваюць тыя вялікія палітычныя і практычныя задачы, якія стаяць перад арганізацыямі ў справе далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва. Канфэрэнцыі згуртоўваюць увагу на баявых пытаньнях моманту — ажыцьцяўленьні калектывізацыі і палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, разгортваньні індустрыялізацыі, выкананьні пяцігодкі ў чатыры гады, праблеме кадраў, прафсаюзаў, культурнага будаўніцтва і г. д. і г. д. **Бальшавіцкае адзінства нашай партыі зьяўляецца залогам таму, што усе тыя трудныя і адказныя задачы, якія стаяць перад намі, будуць выкананы.**

10 ГОД НАЗАД

Разгром г. Барысава белапалякамі

27-га мая 1920-27-га мая 1930 г

(УСПАМІНЫ)

Прайшло 10 год з таго памятнага дня, калі белапалякамі быў разгромлены і спалены г. Барысаў.

Ноччу з 26 на 27 мая 1920 году белапалякі, якія разьмясьціліся ў Нова-Барысаве, адкрылі на Барысаве гураганны агонь, бамбардуючы яго розналібарнымі знарадамі на ўсіх правілах ваеннага мастацтва.

Артылерыйскія знарады градам сыпаліся на горад, усюды выбухі, сыпаліся законныя шыбы, грукаталі разбураныя каменныя і дзеравяныя дамы. Паветра было напоўнена сьвінцом і агнём, якія сеялі наўкола сьмерць і ўсё спустошвалі.

Такі стан працягваўся да 6 гадз. раніцы 27-га мая. Пасьля кароткага перарыву бамбардоўка аднавілася яшчэ больш узмоцненым тэмпам і на горад засыпалі запальваючымі знарадамі.

Загарэўся дом Каждана, на Лепельскай вул., а потым пажары узьнікі і ў іншых частках гораду. Тушыць пажар немагчыма было, бо белапалякі адкрылі агонь і па пажарных. Неўзабаве некаторыя вуліцы Барысава прадстаўлялі сабою буйнючае мора агню, які ахапіў потым амаль палову гораду.

То тут, то там сустракаліся жудасныя сцэны: на тратуарах і бруках ляжалі параненыя і прасілі ратунку. Санітары не спраўляліся надбіраць усіх людзей, якія валяліся на зямлі.

У Доме Ш. Мазо. па Менскай вуліцы, пад руінамі разбураднага ад знарадаў вялікага каменнага склепу было пахавана некалькі дзесяткаў мужчын, жанчын і дзяцей, якія шукалі там ратунку.

За 27 і 28 мая белапалякамі было спалена і зруйнавана каля ⅔ дамоў г. Барысава.

7-га ліпеня 1920 году белапалякі пад напорам пераможнай Чырвонай арміі пакінулі Нова - Бырасаў. Тады бежанцы зноў сталі варочацца ў горад.

Жахі сьмерці, нагібель бацькоў, братоў, сёстраў і матак і нячуваныя пакуты, голад, нэндзу, галечу і руіны — вось што пакінула пасьля сябе барысаўцам 9-месячная белапольская акупацыя.

Доўга не забудзе панска - шляхецкіх бандытаў Барысаўшчына. Але яшчэ больш будзем памятаць нашу гэраічную Чырвоную армію, якая разам з рабочай клясай, разам з працоўнымі вызваліла Беларусь ад белапольскай акупацыі.

Намаганьнямі і воляй рабочае клясы, у саюзе з бядняцка - серадняцкім сялянствам, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, Барысаў аброс новымі фабрыкамі, дамамі, рабочымі пасёлкамі — ён зьяўляецца зараз адным з буйнейшых пралетарскіх цэнтраў БССР.

Д.

Да ведама дэлегатаў XIII-га зьезду КП(б)Б

Арг. камісія ЦК КП(б)Б па скліканьні зьезду КП(б)Б паведамляе:

1. Зьезд будзе адбывацца ў памяшк. Дому Камасьветы (б. клюб імя Карла Маркса).

2. Арганізацыйная камісія па скліканьні зьезду зьмяшчаецца ў памяшк. ЦК КП(б)Б, пакой № 6.

3. Часовая мандатная камісія пачне сваю работу з 27 мая ў памяшк. АБВШ (Камунальная, 27, трамвай № 2).

4. Для членаў і кандыдатаў ЦК і і ЦКК КП(б)Б падпольшчыкаў і цэнтральнага актыву мандаты і пастаянныя гасьцявыя білеты выдаюцца ў часовай мандатнай камісіі; гасьцявыя—разавыя білеты для Менскай арганізацыі—у Менскім АК КП(б)Б.

Талёны на харчаваньне выдаюцца адначасова з атрыманьнем мандатаў.

АРГКАМІСІЯ

Яўрэйскі пагром у Польшчы

21-га мая г. г. ў невялікім мястэчку Пяскох Лютэрскіх, Люблінскага ваяводзтва польскімі чорнасоценцамі быў наладжан яўрэйскі пагром, у часе якога забіта зьверскім спосабам і жанчына і некалькі асоб моцна паранена.

Характэрным зьяўляецца тое, што ня гледзячы на прысутнасьць у мястэчку паліцыі, яна на месца пагрому зьявілася позна ўвечары пасьля таго, як ужо ўсё сьціхла.

НА МОГІЛКІ ПАРЫСКІХ КАМУНАРАЎ ПРЫЙШЛІ 50.000 РАБОЧЫХ

ПАРЫЖ, 25. У сувязі з гадавінай падзеньня Парыскай Камуны, сёньня адбыўся паход у сяло камунараў на могілкі Пэр-Лашэз. Паход быў арганізаваны на закліку і пад кіраўніцтвам кампартыі і ўніітарнай канфэдэрацыі працы і прайшоў, ня гледзячы на ўзмоцненыя паліцэйскія меры і праліўны дождж, з вялікім посьпехам, сабраўшы паводле папярэдніх нестак, ня менш 50 тыс. рабочых. Працэсія мела ў гэтым годзе выразны характар баявой клясавай дэманстрацыі пад лёзунгамі французкай кампартыі. Паліцыя забараніла разгарнуць сьцягі і пяць рэвалюцыйных песьні па-за сьцэнамі могілак, а таксама забараніла падыходзіць да могілак згуртаванымі калёнамі. **Паліцыя ня раз нападала на рабочых, якія энэргічна супраціўляліся.** Па пяноўных даных, пры гэтых сутычках паліцыяй арыштавана 150 дэманстрантаў. Многія паранены, у тым ліку 5 сур'ёзна. Сярод арыштаваных пры выхадзе з могілак 34 находзяць із Індакітаю. Сур'ёзна паранены і арыштаваны на абвінавачаньні ў супраціўленьні паліцыі сакратар французкай сэкцыі МОПР'у т. Руфляньяк. На тым-жа абвінавачаньні арыштаваны муніцыпальны саветнік муніцыпалітэту Іўры, камуністы Бюфар (ТАСС).

МАСАВЫЯ СХОДЫ ПРАТЭСТУ

ВЕНА, 23. Аўстрыйская кампартыя склікае на 28-га мая масавы сход пратэсту супроць антысавецкіх выступленьняў II-га Інтэрнацыяналу, на які запрошаны таксама лідэр аўстрыйскіх рэфармістых Отто Бауэр для тлумачэньня перад рабочымі пазыцыі II-га Інтэрнацыяналу у адносінах да СССР. (ТАСС).

Па Савецкім Саюзе

БОЛЬШ УВАГІ ПРАМКААПЭРАЦЫІ

ПАСТАНОВА ВСНГ СССР

МАСКВА, 26. Даныя ВСНГ СССР зазначаюць, што ў радзе раёнаў прамкаапэрацыя ня выконвае прамфінпляну. **Прэзыдыум ВСНГ СССР запрапанаваў таму ўсім ВСНГ рэспублік зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на работу прамкаапэрацыі.** Павінны быць прыняты энэргічныя меры, каб да канца 3-га кварталу ажыцьцявіць прыняты ў папярэдніх месяцах і дабілася перавыкананьня галовай праграмы. Трэба таксама ўзьнясьці ў мясцовай прэсе кампанію за выкананьне прамкаапэрацыяй сваіх пляноў. **ВСНГ рэспублік павінны рашуча адмовіцца ад пасыўных адносін да прамкаапэрацыі і заняцца сапраўдным рэгуляваньнем яе вытворчай дзейнасьці.** Да гэтага часу на мясцох ёсьць пэўная недаацэнка прамкаапэрацыі і незразуменьне таго, што ад выкананьня ёю прамфінпляну часта залежыць работа дзяржпрамысловасьці і рэалізацыя экспартных заданьняў. (ТАСС).

ПРАМКААПЭРАЦЫЯ І РАМОНТ УБОРАЧНЫХ МАШЫН

МАСКВА. Усекапрамсавет даў **дырэктыву прамкаапэрацыйным цэнтрам саюзных рэспублік аб удзеле прамкаапэрацыі ў рамонце ўборачных машын.** Акрамя таго Усекапрамсавет прапануе арганізаваць уборачныя брыгады з саматужнікаў для дапамогі ва ўборцы ўраджаю калгасаў і, у патрэбных выпадках, таксама бядняцка - серадняцкіх гаспадарак індывідуальнага сэктару. (ТАСС).

НАШ ЭНЭРГА-БАЛЯНС

МАСКВА, 26. Прэзыдыум ВСНГ СССР абгаворваў на апошнім пасяджэньні энэрга-баляне раённых электрастанцый. «Вялізарны рост спажываньня энэргіі—паведаміў у дакладзе тав. Гайстэр — прымушае нас максымальна фарсаваць будаўніцтва электрастанцый. У будучым годзе магутнасьць будуючыхся раённых станцый складзе **5.104.000** кілёват супроць **1.182.000** кілёват станцый, якія дзейнічаюць зараз. Тым ня менш энэрга-баляне будзе ў нас увесь час напружаным. Патрэбен жорсткі рэжым у выдаткаваньні энэргіі і найбольш рацыянальная пастаноўка работы станцый. Электра - будаўніцтва патрабуе вялікае колькасьці абсталяваньня. Тут мы павінны ўзяць рашучую стаўку на максымальную адмову ад імпарту. Прэзыдыум ВСНГ СССР вылучыў камісію для дэтальнай перапраноўкі энэрга-балянсу і ўдакладненьня кантрольных лічбаў электра - будаўніцтва на наступны год. (ТАСС).

VIII Менская партканфэрэнцыя

Выкананьнем пяцігодкі забясьпечым наш пераможны рух наперад

Вячэрняе пасяджэньне 25 мая

Канфэрэнцыя заслухала даклад тав. **АКСЮЧЫЦА аб выніках будаўніцтва ў акрузе на аснове выкананьня пяцігодкі** і далейшых задачах. Па дакладу тав. Аксючыца разгарнуліся актыўныя спрэчкі. У начатку выказаліся т.т. **Рабцэвіч, Ляховіч, Стракоўскі.**

Тав. **Рабцэвіч** спыніўся ў сваім выступленьні на пытаньнях работы мясцовай прамысловасьці. У прыватнасьці, ён гаварыў аб недахопах будаўніцтва ў калгасах.

— Калектывізацыя, гаворыць тав. Рабцэвіч, ставіць перад намі адказныя задачы па разгортваньні будаўніцтва ў калгасах. На жаль, адпаведныя органы не заўсёды ідуць насустрач гэтай справе. Прамоўца паказаў, што аддзел мясцовай прамысловасьці пры Менскім акрвыканкоме зусім ня кіруе будаўніцтвам у калгасах. Тав. Рабцэвіч падкрэсьлівае, што аддзел зварачае невыстарчальную ўвагу на ход будаўніцтва ў раёнах. Падаючы канкрэтныя факты, тав. Рабцэвіч гаворыць, што з прычыны нядбайнасьці некаторых органаў у адным раёне спынілася будаўніцтва цагельных заводаў.—Плян будаўніцтва **Самахвалавіцкай** электрастанцыі—сказаў далей т. Рабцэвіч—быў зацьверджаны. Былі ўхвалены адпаведныя пастановы і асыгнаваны сродкі. Але да будаўніцтва і на сёньняшні дзень ня прыступлена. Ёсьць сур'ёзныя недахопы ў дарожным будаўніцтве.

Тав. **Стракоўскі** ў сваёй прамове падкрэсьліў, што ў мясцовым будаўніцтве акругі дасягнуты вялікія посьпехі. Потым тав. Стракоўскі спыніўся на асобных пытаньнях з дакладу т. Аксючыца.

— Прамысловасьць, гаворыць тав. Стракоўскі, вядзе ў раёнах. Квазаў т. Стракоўскі, ваяваньні на сыраў. Мяшканьні на сыроварнях з дакладу т. Аксючыца.

Тав. **Стракоўскі** ў сваёй прамове падкрэсьліў, што ў мясцовым будаўніцтве акругі дасягнуты вялікія посьпехі. Потым тав. Стракоўскі спыніўся на асобных пытаньнях з дакладу т. Аксючыца.

— Прамысловасьць, гаворыць тав. Стракоўскі, ваяваньні на сыроварнях. Мяшканьні на сыроварнях з дакладу т. Аксючыца.

Многія таварышы ў сваёй прамове падкрэсьлівалі недахопы рабочай сілы ў раёнах. Кваліфікаваная рабочая сила ў раёнах пераважна канцэнтруецца ў гарадах, між тым у раёнах на будаўніцтвах, якія маюць важнае значэньне, часта зусім не хапае рабочых.

Тав. **Готко** адзначыў недахопы ў камунальнай гаспадарцы. Таварышы **Воўк, Новікаў, Пятрушевіч** гаварылі пра пытаньні будаўніцтва ў раёнах. Таварышы адзначалі недахопы ў спрэчках таксама прымалі ўдзельнікі т.т. **Хамко, Грабенчык, Лапцёў, Русаноў, Бялуга** і інш.

Канфэрэнцыя заслухала заключнае слова т. **Аксючыца.**

Рабочая кляса Нямеччыны выступае пад чырвонымі штандарамі пралетарскай рэвалюцыі

Рэвалюцыйныя сьпісы атрымалі вялізарныя перамогі пры перавыбарах фабзаўкомаў

Канфэрэнцыі кампартыі Нямеччыны праходзяць пад знакам непрымірымай барацьбы за ленінскую лінію камінтэрну

Перамога чырвоных сьпісаў

Зараз пралетарская грамадзкасьць Нямеччыны жыве выбарчай кампаніяй у фабзаўкомы. Кампанія яшчэ ня скончылася. Тым ня менш, ужо сёньня можна гаварыць аб буйных посьпехах кампартыі.

Лёзунг рэвалюцыйнай прафапазыцыі—выстаўіць чырвоныя кандыдацкія сьпісы ў **1000** прадпрыемствах—ажыцьцёўлены з перавышэньнем. Летась чырвоныя сьпісы былі выстаўлены толькі ў **500** прадпрыемствах. Усяго прырост зьвыш 100%. Гэта азначае, што ў некаляіх сотнях буйнейшых прадпрыемстваў, у якіх згуртаваны рашаючыя пласты нямецкага пралетарыяту, упяршыню ішла барацьба намік чырвонымі сьпісамі і сьпісамі рэфармістых, з іх ахвосьцем з хрысьціянскіх прафсаюзаў, дэмакратычных і іншых. Вырасшая ў Нямецкай кампартыі зацікаўленасьць сялянствам выявілася ў тым, што ўпяршыню ў гэтым годзе зьявіліся чырвоныя сьпісы ў вёсцы. У шасьці буйных маёнтках Магдэбургскае акругі былі выступуты чырвоныя кандыдатуры ў мясцкомы.

На сёньняшні дзень вынікі выбараў паступныя.

У Рурскай вобласьці на 106 капальнях падана агулам **186.641** голас, а іх за рэвалюцыйную прафапазыцыю — **86.759,** за рэфармістых — **61.249,** хрысьціянскія прафсаюзы — 45.349, гірш-дункэраўскія (дэмакратычныя) — 1205, сындыкалістых — 4192 і жоўтыя — 5179 галасоў.

У Верхняй Сілезіі чырвоныя сьпісы выстаўлены **ў 12-ці** вугальных прадпрыемствах, з агульнага ліку **15.** У гэтых 12-ці прадпрыемствах рэвалюцыйная прафапазыцыя атрымала **15.349** галасоў, рэфармістыя — **8.037,** хрысьціянскія прафсаюзы — 5.698, фашысцкія — 2.144, польскія — 941 і інш. — 283.

У Саксоніі пакуль высьветліліся вынікі выбараў на 130 прадпрыемствах. Чырвоныя сьпісы атрымалі 32.161 голас і 549 мандатаў, рэфармістыя — 29.025 галасоў і 382 мандаты і іншыя адпаведна — 2462 і 16. Аб буйных посьпехах падаюць і з раду іншых раёнаў.

Аднак, побач з гэтымі посьпехамі ёсьць і паражэньні, галоўным чынам, на тых прадпрыемствах, дзе летась партыя атрымала рашучую перамогу.

Гэтыя паражэньні далі повад сямутаму стварыць пават тэорыйку, якая гаворыць, што пасьля прасоўваньня ўперад натуральны крок назад. Такое тлумачэньне ня толькі шкодна, але і супярэчыць фактам. Аб гэтым ясна гавораць вынікі выбараў у Рурскай вобласьці і ў Верхняй Сілезіі, дзе рэвалюцыйная прафапазыцыя летась мела буйны посьпех, што не пашкодзіла ёй і цяпер на выбарах атрымаць прырост галасоў.

У Рурскай вобласьці на 43 капальнях з 90.552 рабочымі, на якіх былі выстаўлены чырвоныя сьпісы і ў мінулым годзе, рэвалюцыйная апазыцыя атрымала у 1930 г. — **33.571** голас і ў 1929 г. — **26,501,** прырост — 7.070; рэфармістыя адпаведна — 21.244 і 25.759, страта — 4515 галасоў, хрысьціянскія прафсаюзы —17737 і 17281 — прырост 456 і г. д.

Гэтыя посьпехі сьведчаць аб тым, што рабочыя масы — за лінію партыі і рэвалюцыйнай прафапазыцыі. Усюды, дзе ўжывалася тактыка стварэньня адзінага фронту зьнізу, дзе былі створаны шырокія, выбарчыя камітэты, мабілізацыя мас вакол лёзунгаў кампартыі крайшла з вялікім посьпехам. Адсутнасьць хістаньняў і апартуністычных уступак, рашучае правядзеньне партыйнай лініі на выбарах у фабзаўкомы без спроб замяніць упартую рэвалюцыйную работу ў масах левай фразай — вось што дало перамогу чырвоным сьпісам.

Паражэньне выклікана тым, што таварышы ў радзе арганізацый пасьля захапленьня летаннім перамогай сталі бясьпечнымі, зараз ліся самазазнаўствам і запусьцілі масавую рэвалюцыйную работу.

Побач з гэтымі палітычнымі адхіленьнямі ад правільнай партыйнай лініі, былі таксама і памылкі арганізацыйнага характару. На многіх прадпрыемствах, на якіх чырвоныя сьпісы пацярпелі паражэньні, былі дрэнна арганізаваны делегацкія інстытуты. Бывалі часта выпадкі, калі чырвоныя члены фабзаўкомаў не даволі рашуча выступалі супроць масавых звальненьняў і слаба мабілізавалі масы супроць капіталістычнай рацыяналізацыі.

Посьпехі кампартыі на выбарах у фабзаўкомы і рашучая бальшавіцкая самакрытыка служаць парукай, што дапушчаныя памылкі будуць зжыты і гэта дасьць магчымасьць ня толькі замацавець ужо заваяваныя пазыцыі, але і рухацца ўперад насустрач новым перамогам.

А. В.

БЭРЛІНСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПАД ЗНАКАМ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ

БЭРЛІН, 25 мая. Даклад т. Ульбрыхта і разгорнутыя па дакладу спрэчкі на Бэрлінбрандэнбургскай акруговай канфэрэнцыі кампартыі прайшлі пад знакам бальшавіцкай самакрытыкі. Пастаўіўшы ў цэнтры свайго дакладу задачу рэвалюцыйнай масавай работы, т. Ульбрыхт канстатаваў, што ўсё узрастаючае зьбядненьне мас і палявеньне рабочае клясы ствараюць, асабліва ў Бэрліні - Брандэнбургскай акрузе, спрыяючыя ўмовы для заваёў большасьці рабочае клясы камуністычнай партыяй. Калі вынікі апошніх 15 месяцаў ад часу апошняга партыйнага зьезду ня зусім здавальняючыя, дык гэта тлумачыцца тым, што пры правядзеньні партыйнай лініі былі дапушчаны памылкі ў бок праваапартуністычнага і «лева-сэктанцкага ўхілу». З гэтага пункту погляду Ульбрыхт аналізуе работу камуністычнай партыі на заводах, у прафсаюзах і інш. масавых арганізацыях пралетарыяту, у іх барацьбе, на выбарах фабзаўкомаў і г. д.

Цэнтральнае месца ў спрэчках заняла прамова т. Тэльмана, які падкрэсьліў асаблівае значэньне бэрлінскай арганізацыі для ўсёй партыі і зазначыў, як на станоўчыя, так і на адноўныя бакі партыйнай работы Бэрлін-брандэнбургскай арганізацыі. Спыніўшыся на пытаньні аб кадрах, т. Тэльман сказаў: «Нам непатрэбны адны толькі камандзіры, нам патрэбны чулыя работнікі з нашага партыйнага актыву».

У спрэчках выступілі рабочыя з заводаў, рабочая моладзь, камсамольцы і ніткіку партработы і ўпутрыпартыйнай барацьбы на два франты. Пры гэтым яны пацьвярджалі правільнасьць становішча т. т. Ульбрыхта і Тэльмана аб тым, што галоўнай задачай зьяўляецца арганізацыя пралетарскага контрнаступленьня за павышэньне заработнай платы ў адказ на наступленьне капіталістых.

Канфэрэнцыя пастанавіла склікаць на 6 чэрвеня канфэрэнцыю прафапазыцыі Бэрлін - Бранд

НА ШЛЯХОХ ДА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Загартаваныя ў непрымірымай барацьбе з апартунізмам партыйныя арганізацыі ідуць да XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б)

ЦЯСЬНЕЙ РАДЫ НАЎКОЛА ЛЕНІНСКАГА ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б

Бязьлітасны адпор усякім спробам справа і зьлева дыскрэдытаваць бальшавіцкае кіраўніцтва партыі Леніна

Віцебская партканфэрэнцыя

СПРАВАЗДАЧА АК КП(б)Б

Даклад тав. Чычэрава

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Сьледам за абм... ЦКК КП(б)Б кан... справаздачу акру... рабоце за пярыяд... цыі.

Даклачык—сакр... раў—у пачатку с... чы аб тых задачах... вае перад арганізаці...

— Усл работа арганізацыі пр... зунгам практычн... задач індустрыяліз... тывізацыі сельска... аснове ліквідацыі... Барацьба за прав... не генэральнай л... з правымі правы... нізму і прымірэн... сталла, як адна з... задач, перад арга... Усяго справаздачн... ты. І толькі таму... былі сканцэнтрав... рацьбу з усялякім... тыйнай лініі, толь... цыя ў штодзённа... праводзіла правы... лінію партыі, да... цыі арганізацыя... посьпехамі на ўс... стычнага будаўніц...

За гэты пярыяд... лі рад праяў пра... Лёзьнянскім раёне... не даацэньвала п... рыяду работы ся... тва, што прывяло... ня кіраўнікоў ар... нізму. На фабры... адкрытыя выступ... тунгістых, у ліку... тар пэхацкай ячэйк...

Мы мелі і інш... партыйнай лініі... арганізацыях. У... мела месца паня... мылак у работе... фактаў «левых»... няў выпраўленьн... рагібаў.

На некаторых... фінтэрн», «Дзьвін... а», гарбарня) мелі мес... ня выпадкі яўна... кі ў выгляде п... цю рабкорыўскага...

На ўсім гэтым... каў скажэньняў... падках парушэнн... ганізацыя ўдарыла... рашучасьцю.

Арганізацыі да... ...ялося правесьці вялі... кую работу ў спэ... ...ве рэарганізацыі акругі. І сёньня ўжо можна сказаць, што гэта работа дала свае станоўчыя рэзультаты. Практыка рэарганізацыі сябе апраўдала. Больш выразна пачаў працаваць увесь акруговы апарат, мы зараз хутчэй можаш рэагаваць на кожны асобны факт з жыцьця таго ці іншага раёну, чымся округа перэарганізаваная.

Гаворачы аб стане прамысловасьці, дакладчык падаў рад фактаў і лічбаў, якія красамоўна гавораць аб шпаркім росьце прамысловасьці Віцебшчыны. Выпуск прадукцыі ў параўнаньні з мінулым годам вырас на 64 проц. Колькасьць занятых рабочых у прамысловасьці павялічылася на 30, 7 проц. Рост прамысловасьці округі дазваляе прыступіць да будаўніцтва новых прадпрыемстваў (панчошная фабрыка, шэйная, алення).

Аднак, у сэнсе якасных паказальнікаў прамысловасьці ёсьць рад недахопаў. Так, рост прадукцыйнасьці працы меркавалася ўзьняць на 24 з лішкам проц., а мы дасягнулі павышэньня толькі на 20,7 проц.

З выкананьнем прамфінпляну па радзе прадпрыемстваў наглядаецца адставаньне. За першае паўгодзьдзе бягучага гаспадарчага году прамфінплян выкананы толькі 2-ма прадпрыемствамі: лесазаводам (104,9 проц.), і панчошнай фабрыкай (101,4 проц.). А рад прадпрыемстваў: «Дзьвіна» (97,5%), Віцпэвэй (99,8%) і інш блізкі да выкананьня. Выкананьне прамфінпляну на 21 прадпрыемстве на 95,5 гаворыць аб тым, што напы партарганізацыі, саюзы і камсамол у гэтым кірунку правялі невыстарчальную работу.

Высьвятляючы перад канфэрэнцыяй работу прафсаюзаў, тав. **Чычэраў** паказаў на тое, што рэарганізацыя округі дала магчымасьць наблізіць прафарганізацыі да прадпрыемстваў, умацаваць нізавыя кіруючыя органы саюзу за кошт ліквідацыі акруговых праўленьняў саюзаў.

У справе калектывізацыі набыты вялікія посьпехі. Калі ўвесну 1929 г. на акрузе было 1,4 проц. калектывізаванай плошчы і 1,3 проц. на колькасьці гаспадарак, то зараз мы маем 10,8 проц. калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і 12,8 проц. плошчы.

Нельга не паказаць на адно характэрнае зьявішча ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі, якое заключаецца ў зьмяншэньні засеву тэхнічных культур пры павышэньні іх таварнага балянсу і павялічэньні ўдзельнай вагі кармавых траў. У 1927 годзе збожжавыя культуры складалі 70 проц. да агульнага засеву на акрузе, а ў 1930 г. яны складаюць 61 проц. З тэхнічнымі культурамі наадварот, мы маем іх значны рост.

У справаздачы АК, дакладчык шмат увагі аддаў пытаньням барацьбы парт-арганізацыі з тымі перагібамі і скажэньнямі партыйнай лініі, якія мелі месца пры правядзеньні калектывізацыі. Дакладчык падкрэсьліў, што **АК прызнаў свае памылкі і адразу-ж пасьпяшаў артыкулаў тав. Сталіна стаў на шлях рашучага іх выпраўленьня.** АК для работы па выпраўленьні дапушчаных на мясцох памылак і перагібаў мабілізаваў 75 чал. з партыйнага акруговага актыву, спэцыяльна абсьледаваў 7 раёнаў, а 6 раёнаў заслухаў даклады.

Сакратар Віцебскага АК КП(б)Б т. Чычэраў.

Партарганізацыя жорстка ўдарыла па тых супраціўленьнях ажыцьцяўленьню партыйных дырэктыў, якія мелі месца сярод асобных членаў партыі.

— На фронце разгортваньня самакрытыкі—гаворыць тав. Чычэраў—мы ў нашай арганізацыі мелі рад сур'ёзных прарываў. Справа з газэтай **«Віцебскі Пралетары»**, зацісканьне самакрытыкі ў форме прасьледаваньня рабсэлькораў і інш. Усе гэтыя моманты гавораць аб наяўнасьці слабой работы па разгортваньні самакрытыкі. АК КП(б)Б за апошні пэрыяд ужыў рад захадаў, накіраваных на разгортваньне самакрытыкі.

Віцебская арганізацыя—гаворыць тав. Чычэраў—за справаздачны пэрыяд вырасла па 23 проц., г. зн. прынята 1.049 новых членаў. Гэты прырост значна павялічыў рабочую праслойку ў арганізацыі.

Далей дакладчык высьветліў перад канфэрэнцыяй работу арганізацыі ў галіне культурнага будаўніцтва, вылучэньня рабочых у савецкі апарат і інш. Па дакладу разгарнулося шырокія спрэчкі.

А. КАРАЧУН.

На варце генэральнай лініі

Рэзалюцыя Гомельскай канфэрэнцыі па дакладу ЦКК КП(б)Б

(Прынята аднагалосна)

Заслухаўшы даклад т. **Калініна** аб рабоце ЦКК КП(б)Б, **Гомельская** акруговая партканфэрэнцыя прызнае палітычную лінію ЦКК правільнай і работу яе за справаздачны пэрыяд здавальняючай.

Канфэрэнцыя адзначае, што ЦКК цьвёрда стаяла на чале захаваньня адзінства радоў КП(б)Б, праводзіла рашучую барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, накіроўваючы галоўны агонь па правым апартуністычным у тэорыі і па практыцы, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, па «левых» загібах і рэшках контрэвалюцыйнага трацкізму, па прымірэнцтве да ўхілаў ад лініі партыі. ЦКК правяла значную работу ў выкрыцьці паасобных праяўленьняў правааапартуністычнай практыкі ў рабоце фінансавых, судова-сьледчых і інш. органаў, асабліва па лініі калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Стоячы на чале правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, ЦКК рашуча змагалася са скажэньнямі лініі партыі, з нацыянал-апартунізмам у КП(б)Б, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і з праявамі розных шавінізмаў, беларускага, вялікадзяржаўнага, яўрэйскага і інш. (справы Жылуновіча, Кунцэвіча, Зарэцкага і інш.).

Канфэрэнцыя падкрэсьлівае рашучую лінію ЦКК у справе разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі і значную дапамогу мясцом на выкрыцьці фактаў заціску самакрытыкі. З асаблівым задаваленьнем канфэрэнцыя адзначае работу ЦКК у справе выкрыцьця прарываў у гэтай галіне, меўшых месца ў Гомелі, і значную дапамогу нашай арганізацыі ў выпраўленьні апартуністычных памылак, меўшых месца ў кіраўніцтве Гомельскай арганізацыі. Канфэрэнцыя поўнасьцю ўхваляе пастановы і мерапрыемствы ЦКК па аздараўленьні кіраўніцтва ў Гомельскай арганізацыі.

За справаздачны пэрыяд ЦКК правяла вялікую работу на кіраўніцтве і непасрэдным правядзеньні генэральнай чысткі радоў КП(б)Б ад чужых элемэнтаў, ад тых, хто разлажыўся і абюракраціўся. У працэсе самой чысткі і ў рэзультаце яе значна вырас аўтарытэт партыі ў масах рабочае клясы і батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас сялянства, што знайшло сваё праяўленьне ў прыцёку новых соцень і тысяч пралетараў у рады КП(б)Б.

Адзначаючы, што з боку ЦКК праведзена вялікая арганізацыйная і растлумачальная работа па чыстцы і палянізацыі работы савецкага і каапэрацыйнага апарату і мабілізацыі мас навакол гэтае работы, канфэрэнцыя, аднак, адзначае, што на мясцох невыстарчальна зварачалася ўвага на правядзімую чыстку апарату, асабліва ў адносінах прыцягненьня рабочых да ўдзелу ў чыстцы.

Канфэрэнцыя адзначае ўзмацненьне кіраўніцтва і інструктажу з боку ЦКК-НК РСІ акруговымі органамі КК-РСІ, таксама значнае ўцягненьне рабочага актыву ў работу КК.

Побач з гэтым канфэрэнцыя адзначае, што з боку ЦКК былі выпадкі несвачасовага рэагаваньня на паасобныя праваапартуністычныя ўстаноўкі і дырэктывы, даныя цэнтральнымі ўстановамі (Наркамзем, Калгасцэнтр, Сампрамкаапэрацыя і інш.), асабліва ў галіне калектывізацыі, таксама не заўсёды ЦКК папярэджвала паасобныя прарывы на мясцох.

Канфэрэнцыя ўпэўнена, што Гомельская партарганізацыя пад кіраўніцтвам ЦК і ЦКК КП(б)Б яшчэ больш разгорне сапраўды дзейсную бальшавіцкую самакрытыку, ужыгне шырокія колы рабочых і батрацка-бядняцкія, серадняцкія масы ў сацыялістычнае будаўніцтва, разгорне яшчэ больш рашучую барацьбу з бюракратызмам, зацісканьнем самакрытыкі і ўсялякімі скрыўленьнямі лініі партыі ў рабоце нашага апарату.

Канфэрэнцыя заклікае ўсе партарганізацыі захоўваць ленінскае адзінства нашай партыі, весьці рашучую барацьбу па два фронты супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» апартуністычных загібаў, супроць нацыянал-апартунізму, як найбольшай небясьпекі на даным этапе ў КП(б)Б, і супроць усялякіх іншых шавінізмаў, таксама і з прымірэнцтвам да ўхілаў ад ленінізму.

Канфэрэнцыя даручае ЦКК даць рашучы адпор апартуністычным элемэнтам, якія прабуюць дыскрэдытаваць бальшавіцкае кіраўніцтва нашае партыі, якія ў пэрыяд падрыхтоўкі да XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б) хочуць упесьці дэзарганізацыю ў нашы рады. Загартаваная ленінскім адзінствам і бальшавіцкай дысцыплінай. Гомельская арганізацыя, як і ўся КП(б)Б, прыдае да свайго зьезду і да XVI зьезду ЎсеКП(б) пад сьцягам ленінізму, вернай генэральнай лініі партыі і яе бальшавіцкага ЦК.

Закрылася Аршанская канфэрэнцыя

Канфэрэнцыя ацаніла лінію АК КП(б)Б у справе калектывізацыі, як прымірэнцтва да перагібаў і апартуністых

(Па тэлефону ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

ВОРША, 26. Партканфэрэнцыя, усебакова абгаварыўшы ў камісіі і на заключным пасяджэньні справаздачу АК КП(б)Б, у зьмену свае пастановы, якая была надрукавана ў «Зьвязьдзе» ад 26 мая, адназгодна прыняла наступную ацэнку па справаздачы АК КП(б)Б. «Заслухаўшы даклад тав. Вілінстовіча аб рабоце АК КП(б)Б за пэрыяд ад V акрпартканфэрэнцыі VI канфэрэнцыя КП(б)Б Аршанскай акруговай арганізацыі адзначае некаторыя станоўчыя бакі ў рабоце АК, як у галіне прамысловасьці, так і ў галіне партбудаўніцтва, разам з гэтым канфэрэнцыя мічыць правільнай ацэнку палітычнай дзейнасьці, даную пастановай ЦК і ЦКК КП(б)Б ад 16 мая г. г. Аршанскаму АК КП(б)Б, цалкам і поўнасьцю ўхваляе гэтую пастанову».

Канфэрэнцыя асабліва падкрэсьлівае, што ўжо пасьля дырэктыў партыі аб рашучай барацьбе з дапушчанымі перагібамі, пры наяўнасьці грубых скрыўленьняў і парушэньняў партыйнай лініі як з боку АК, так і з боку асобных мясцовых арганізацый у справе калектывізацыі, **АК КП(б)Б ня ўлічыў палітычнага значэньня зробленых памылак і скажэньняў, ня здолеў мабілізаваць партыйную арганізацыю на рашучую барацьбу і шпаркае выпраўленьне дапушчаных памылак і скажэньняў, выявіў фармальныя адносіны нават да такіх зьявішч, як ганебныя выступленьні асобных камуністых супроць дырэктыў партыі аб выпраўленьні памылак і перагібаў.**

Усё гэта канфэрэнцыя расцэньвае, як прымірэнцтва з боку АК КП(б)Б да перагібаў і апартуністых».

Гэта ацэнка цалкам і поўнасьцю адпавядае таму, што на працягу апошняга часу пісала «Зьвязда», на становішча аршанскага парткіраўніцтва і што са ўсёй рашучасьцю падкрэсьлена ў пастанове ЦК і ЦКК КП(б)Б ад 11 і 16 мая г. г.

Аршанская канфэрэнцыя, хоць у канцы сваёй работы, пабальшавіцку, са ўсёй рашучасьцю пралетарскай самакрытыкі ацаніла работу мінулага кіраўніцтва АК КП(б)Б.

Канфэрэнцыя даручыла новаму складу АК КП(б)Б, як баявую задачу—мабілізаваць усю партарганізацыю на рашучае і шпаркае выпраўленьне дапушчаных скажэньняў партлініі ў справе калектывізацыі, на бязьлітасную барацьбу з правымі ухілам, як найбольшай небясьпекай на даным этапе, супроць «левых» загібамі і прымірэнцкімі да іх адносінамі.

Канфэрэнцыя асабліва падкрэсьлівае, як важнейшую задачу, неабходнасьць сыстэматычнай работы сярод батрацкіх і бядняцкіх мас, палітычна - гаспадарчае замацаваньне калгасаў, узмацненьне арганізаванай ролі калгасаў у справе дапамогі індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, гаспадарчае і вытворчае дапамогі гэтым гаспадаркам у мэтах стварэньня глебы для далейшага развіцьця калгаснага будаўніцтва на аснове ленінскай устаноўкі аб добраахвотнасьці.

Позна вечарам 26 мая канфэрэнцыя, абраўшы АК, АКК і дэлегатаў на зьезды, зачынілася.

ВАШКЕВІЧ.

Да XVI зьезду УсеКП(б)—ніводнага незасеянага га

Безадкладна пачаць падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі

Узмацніць тэмп сяўбы

Паводле даных Наркамзему, плян засеву на 20 мая калгасамі БССР выкананы толькі на 56,5 проц. У паўднёвых акругах калгасы павінны былі ўжо скончыць сяўбу, аднак, плян яшчэ і імі ня выкананы.

Асабліва дрэнна праходзіць сяўба тэхнічных культур у калгасах — плян выкананы толькі на 24 проц. Калгасы ільнаводных округ яшчэ не разгарнулі сяўбы тэхнічных культур. Так, у Віцебскай акрузе плян засеву тэхнічных культур выкананы толькі на 11,7 проц. у Полацкай — на 7 проц. і ў Аршанскай—на 18,6 проц.

Дрэнны ход сяўбы тэхнічных культур у калгасах тлумачыцца выключна недастатковай увагай калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы да гэтай важнейшай кампаніі. Ёсьць, акрамя таго, выпадкі, калі калгасы ўхіляюцца ад пасеву тэхнічных культур, як больш працаёмкіх. Многія калгасы імкнуцца забясьпечыць сябе, у першую чаргу, спажывецкімі культурамі, ня выконваючы плану засеву тэхнічных культур.

Тэмп сяўбы бульбы ў калгасах таксама невыстарчальны, асабліва ў паўдзённых округах. Так, Мазырская акруга выканала плян толькі на 56,5 проц. Бабруйская — на 47,5 проц., Менская—на 47,3 проц. і Магілеўская — на 61,3 проц.

Месцы яшчэ практычна не заняліся падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі. Між тым, да 15 чэрвеня пляны ўборачнай і асенняй пасеўнай кампаніі павінны быць даведзены да кожнага калгасу.

Калгасы павінны зараз-жа прыступіць да складаньня рабочых праграм на правядзеньні ўборачнай кампаніі і асенняй сяўбы. У часе міжпар'я рабочыя праграмы трэба абгаварыць на шырокіх сходах калгасьнікаў.

Белгасснабу і Паліводсаюзу дана заданьне не пазьней 15 чэрвеня завезьці ўборачныя машыны для калгасаў і першачатковых аб'яднаньняў з тым, каб шапачатковых аб'яднаньняў з тым, каб не пазьней 1 ліпеня гэтыя машыны былі ўжо на мясцох. Плян арганізацыі ралі ўжо на мясцох. Плян арганізацыі ралі ўжо на мясцох, які ў часе веснамонтных майстэрань, які ў часе веснамонтных майстэрань, якія ў часе веснавой пасеўнай кампаніі ня быў выканан, неабходна зараз цалкам выканаць.

Вялікую ролю ў пасьпяховым выкананьні ўборачнай кампаніі павінна адыграць правільная арганізацыя працы ў калгасах. Калгасцэнтрам даны дырэктывы аб арганізацыі ўборачных брыгад, якія пасьля выкананьня работы ў калгасах павінны дапамагчы ўборцы ўраджаю ў індывідуальных гаспадарках.

Да гэтага часу на мясцох не разгорнута работа па арганізацыі першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў. Перад усёй калгаснай сыстэмай стаіць задача шырока разгарнуць арганізацыйную работу з тым, каб да восені бягучага году 85 проц. усіх бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, якія ня ўцягнуты ў калгасы, былі аб'яднаны ў першапачатковыя вытворчыя аб'яднаньні.

У сувязі з недахватам цягавай коньскай сілы, трактары ў часе веснавой пасеўнай кампаніі адыгралі вялікую ролю. Але побач з гэтым наглядаецца рад фактаў нерацыянальнага безгаспадарчага выкарыстаньня трактараў. Так, у Магілеўскі акрузе ў прыгараднай малочнай фэрме імя Калініўскага пры правым кліне ў 400 гэкт. ёсьць 157 коняй і 1 трактар. Зараз чамусьці Магілеўскі акраз гэтай гаспадарцы даў дадатково яшчэ адзін трактар, які, зразумела, будзе стаяць бяз працы.

У радзе раёнаў трактарыстым прыходзіцца прастойваць на два-тры дні ў райкалгасасаюзах за атрыманьнем пэнсіі. Трактары ў гэты час не працуюць.

Месцы павінны зараз-жа пераразмеркаваць трактары, арганізаваўшы рацыянальнае скарыстоўваньне ўсёй цягавай сілы.

А.

Сяўба пятрушкі і моркавы ў калгасе імя Чарвякова ў Пухавіцкім раёне.

Сяўба ў саўгасах БССР

Паводле вестак Белсельтрэсту, 145 калгасамі БССР на 20 мая засеяна 19.648 гэкт. ці 66,05 проц. пляну.

У паасобных округах саўгасы выканалі плян засеву наступным чынам: Менская — 68,9 проц., Бабруйская — 70,1 проц., Мазырская — 66,4 проц., Магілеўская — 70 проц., Полацкая — 53,1 проц., Віцебская — 57,2 проц., Аршанская — 59 проц. і Гомельская — 52 проц.

Па асобных культурах выкананьне пляну саўгасамі наступнае: авёс — 78,6 проц., ячмень — 90,3 проц., лён — 14,7 проц., каноплі — 42,8 проц., бульба — 67,5 проц., слоначнік — 68 проц., кукуруза — 59,6 проц., насеньне вікі—126,3 проц., сэрадэля — 97,7 проц., насеньне лубіну — 76,5 проц., лубін на ўгнаеньне — 17,4 проц., гародніны — 83,2 проц., насеньне лугавых траў — 12,7 проц. і ўкоснай канюшыны — 7,9 проц.

Насенная гаспадарка «Канстантынава» выканала плян з перавышэньнем

Насенная гаспадарка «Канстантынава» ў Мазырскай акрузе павінна была паводле пляну засеяць 22 гэкт. аўсу, 22 гэкт. канюшыны, 70 гэкт. сэрадэлі, 47 гэкт. вікі, 16 гэкт. кораньплоду, 28 гэкт. бульбы і 400 гэкт. лубіну.

На 20 мая плян веснавой сяўбы быў выканан. Засеяна: 30 гэкт. аўсу, 30 гэкт. канюшыны, 75 гэкт. сэрадэлі, 52 гэкт. вікі, 17 гэкт. кораньплоду, 28 гэкт. бульбы і 400 гэкт. лубіну.

Як відаць з гэтых лічбаў, пасеўны плян перавыкананы амаль па ўсіх культурах.

Гэтыя посьпехі тлумачацца сьвядомымі адносінамі рабочых да справы і ўдарнымі тэмпамі працы.

А. Ш.

Перад „жудаснай многазначнасьцю" фактаў*)

В. ДЗЯТЛОЎ

ТВАРАМ ДА ТВАРУ

Крушэньне надзей на перараджэньне бальшавізму, яўна неўгрунтаваныя разьлік на кулака, як тое, што, сустракаючыся з гэтай сілай, бальшавікі «эксперымэнт» сарвецца, што кулак выкрыле ідэі сацыялізму, усяляе законную трывогу ў галовы і сэрцы прадстаўнікоў інтарэсаў капіталу.

«Трэба,—гаворыць усё той-жа Шэфэр, — паспрабаваць зірнуць глыбей саміх фактаў, каб прынамсі зьмякчыць іх амаль жудасную многазначнасьць».

Ня цяжка прадчуць, што разумее Шэфэр пад спробай «зазірнуць глыбей саміх фактаў». Вельмі характэрнымі з гэтага пункту погляду зьяўляюцца яго наступныя «успаміны»:

«Оўэн Юнг у сваёй прамове ў Харвардзе летась заявіў, што ў яго ўзьникілі сумненьні наконт таго, што сучасная капіталістычная сыстэма зьяўляецца апошнім словам мудрасьці. Ён гэтага гаварыў аб магчымасьці перабудаваць не на каапэрацыйнай аснове. Ужываньне, якое савецкая дзяржава, што ўладае, праўда, найбольш поўным дыктатарскім суверэнітэтам, зробіла з гэтай каапэрацыйнай сыстэмы, дае некаторую падставу меркаваць, што і каапэрацыйная сыстэма далёка не зьяўляецца зусім заканчаным гаспадарчым ладам, а мае імкненьне да чыстага сацыялізму».

Відавочна, спроба «зірнуць глыбей саміх фактаў» прывяла Шэфэра да бязрадаснага выводу аб тым, што на сусьветнай гістарычнай арэне паўсталі тварам да твару дзве сілы, дзве сыстэмы: капіталістычная і «чысты сацыялізм». З гэтай апошняй сілай, з гэтай апошняй сыстэмай «чыстага сацыялізму» Шэфэр сёньня вымушан лічыцца, як з рэальнай сілай, якая далёка выйшла за рамкі праграмных дэкларацый, як з рэальнай сыстэмай, што нераможна ажыцьцяўляецца і моцна ўгрунтоўваецца на шостай частцы зямнога кулі. Яшчэ ўчора быў жывы надзеі, што «чысты сацыялізм» так і застанецца нежыцьцяўчнай марай камуністых, што рэвалюцыйны марксызм застанецца бязжыцьцёвай «догмай» невялікай кучкі фанатыкаў. У гэтым перакананасьці ўжо і тое—гаворачы словамі Шэфэра «ужываньне», якое сусьветны сацыялфашызм прабуе зрабіць з марксызму, маскуючы вокладкамі даўно адхіленых выданьняў паліцэйскі мундэр гіндэнбургскай рэспублікі. Яшчэ ўчора ў якасьці прынятага правядзеньня часу можна было з паблажлівай усьмешкай слухаць салодзенькія абываталькія словаспрачкі наконт перабудовы капіталістычнай сыстэмы на каапэрацыйнай аснове. І «рантам» нелк зусім «нечакана» здарылася так, што абвяшчэньне «Карл Маркс у савецкай вёсцы», жывы, сапраўдны, рэвалюцыйны Карл Маркс, што «чысты сацыялізм» у рэзкіх рэальных абрысах вырас на гістарычнай арэне, і ці ня ў тым «жудаснай многазначнасьць» гэтай «падзеі», што і ў вачох Шэфэра сацыялістычная сыстэма, калі ўжо гаварыць аб «апошнім слове мудрасьці», мае бясспрэчныя перавагі перад капіталізмам перавагі, якія Шэфэр меў прымемнасьць, жыючы на тэрыторыі нашага Саюзу, на практыцы і навочна сузіраць. Мысль Шэфэра мімаволі зьвярнулася да Юнга: магчыма, сапраўды вёсьць якаясьці «трэцяя» сіла, трэцяя сыстэма, якая-б, калі-б не прадухіліла, дык адцягнула-б на некаторы час сутычку гэтых дзьвёх сыстэм. Ня трэба, вядома, Шэфэра несправядліва падазраваць у нацыфіскіх настроях. О, не. Ён успомніў пра Юнга толькі таму, што ў яго не хапае ўпэўненасьці ў пераможным для капіталізму выходзе барацьбы гэтых сыстэм. Але ён тут-жа вымушан быў і адкінуць рэцэпт Юнга, цьвяроза ацаніўшы, што каапэрацыйная сыстэма пры капіталізме—вельмі слабая, яна пры сур'ёзным змаганьні ня можа ісьці ў разьлік падпоры, а ў «чыстым» выглядзе яна ніяк не ўзьляцціць капіталізму і несумяшчальна з ім, яна сапраўды «родная» толькі савецкай уладзе, толькі ў руках пралетарскае дзяржавы яна набывае сваё закончанае завяршэньне ў выглядзе «чыстага» сацыялізму.

Так бязьлітасна адным подыхам гісторыі зносяцца капітачныя домікі мізэрных рэфармісцкіх ідэй, так зьдамухваюцца і упчэнт разьбіваюцца ад вогненага дыханьня сацыялістычнай рэвалюцыі ідэйныя лахманы стракатых дэкарацыйных упрыгожаньняў, якімі бяссільна прабавалі прыкрыць агаленасьць капіталізму рэфармістыя шматлікіх колераў і адценьняў.

Два сьветы, дзьве сілы стаяць адна перад адной... Гэта разумее ня толькі Шэфэр.

«Мне давялося, — кажа карэспандэнт «Нью-Ёрк Таймс Дзюранты, прадстаўнік ужо не эўрапейскай, а заакіянскай буржуазіі,—даваць справаздачу аб бойцы пры Вэрдэне, гэтай сапраўды жудаснай падзеі. У працягу аднаго дня французская армія тысячы раз пераходзіла ад перамогі да паражэньня і ад паражэньня да перамогі. Якой драбніцай у параўнаньні з гэтай падзеяй здаецца забойства камуністага, падпал калгасу, або пакараньне кулака. І, аднак, я лічу, што змаганьне, якое адбываецца зараз у СССР, з пункту гледжаньня сусьветнай гісторыі, мае ня меншае значэньне, чым Вэрдэн. **Ад зыходу гэтага змаганьня залежыць будучае ня толькі СССР, але і усяго сьвету».**

Калі перавесьці падкрэсьленыя мною словы Дзюранты на клясавую мову, то ясней стане і мысьль самога Дзюранты:

— Ад зыходу гэтага змаганьня залежыць будучае сусьветнага капіталізму. **Вораг гаворыць клясавую праўду.** Сацыялістычная рэвалюцыя ў сваім разьвіцьці ўжо перахлёствае межы нашае краіны. Выкарчоўваньне карэньняў капіталізму, ліквідацыя апошняе капіталістычнае клясы ў нашым краі на базе суцэльнай калектывізацыі, на базе бурнага працэсу індустрыялізацыі ў корані маняе суадносіны сусьветных сіл, пагражэньнямі ў міжнародных жыцьцёвых адносінах і сувязях, рэзка аслабляе пазыкрацу, так і ў адносінах да калёній, узмацніце сілы, моц і рашучасьць рэвалюцыйнага пралетарыяту перадавых капіталістычных дзяржаў, будзіць невычарпальныя крыніцы рэвалюцыйнай энэргіі сярод прыгнечаных народаў калёніяльных і поўкалёніяльных краёў.

Сапраўды, хіба не відавочным становіцца той факт, што ў самым бліжэйшым будучым выхватваецца, вырываецца з дружэлюбных лап капіталістычнай залежнасьці шостая частка сьвету. Ці-ж гэта ня ўдар сусьветнаму капіталізму, які задыхаецца ў пятлі крызісаў і ў пошуках новых рынкаў, які рыхтуецца да новага крывавага перадзелу сьвету.

Хіба не рэальная становіцца пагроза ўжо заўтра спаткацца на сусьветным рынку з мільёнамі тон саўгаснага і калгаснага збожжа. І дзе гарантыя таго, што пасьлязаўтра не пачнуць слабець, рвацца ніці капіталістычных сувязей у радзе іншых галін эканомікі. Дзе гарантыя таго, што сацыялістычная пяцігодка, якая яшчэ ўчора здавалася простай камуністычнай праклямацыяй, ня выбе'е з рук буржуазіі тыя эканамічныя сродкі, пры дапамозе якіх калёніі яшчэ сёньня трымаюцца ў рабскім паслухмяностве.

Вось яна «жудасная многазначнасьць» бясспрэчных, неабвержных фактаў. І перад ёй, гэтай жудаснай многазначнасьцю, кроўнай справай сусьветнай буржуазіі робіцца кліч—«расійскі кулак у небясьпецы», перад ёю клясавае змаганьне ўнутры нашага краю пачынае ўсё больш непасрэдна перарастаць у рашаючую схватку двух паўстаўшых тварам да твару на сусьветнай гістарычнай арэне сіл—капіталізму і сацыялізму.

НЕЙКАЯ БЯЛЯНСАВАЯ ПРЫКЛІДКА.

«Яшчэ рана прадракаць, — піша «Манчэстэр Гардыян»,—які лёс напатакае гэты гіганцкі вопыт сацыялізацыі сельскае гаспадаркі». На гэтым, як быццам сходзіцца ўся буржуазная прэса. Але ў той-жа час яна выказвае вельмі мала сумненьняў адносна ўдачы гэтага вопыту.

«Чым выклікана падобнае цуда», задасьцца пытаньнем «Чыкага Дэйлі Ньюс». Але ня мае сілы яе карэспандэнт Н. Фарсон сфармуляваць блізкі да ісьціны адказ:

«Сілай, гаворыць ён. Але ня толькі сілай. Роспаччу—другі адказ. І, вядома, роспач—адна з важнейшых прычын. Ёсьць і яшчэ прычына—спакуса атрыманьня ўрадовых крэдытаў. І ў дадатак—калектыўная гаспадарка сама па сабе мае шмат бясспрэчных пераваг».

Прыходзіцца прачытаўшы гэту «фармулёўку», успомніць яшчэ раз вельмі да рэчы зробленае сваім чытачом папярэджаньне М. Фарбмана, што «вывучэньне калгаснага руху ня зусім звычайныя заняткі для вандроўцы і журналістара». Але даруем Н. Фарсону яго няўважлівае абагуленьне, у якім «бясспрэчныя пераваг» калектыўнае гаспадаркі аказаліся ў «дадатку». Паслухаем лепш тое, у чым спрачацца супроць яго аўтарытэту мы так лёгкадумна, як зрабіў гэта ён са сваім «абагуленьнем», не бяромся. Паслухаем тое, што яго спракатыкаванае вока журналістага схапіла «ў дадатак» да зробленага ім «абагуленьня». Вось што піша ён:

«Чырвоная рабочая занятыя зборам растучага золата Савецкага Саюзу»,—гэта было грандыёзнае відовішча...

Малатарня, якою нават кепска кіруюць, больш раласнае відовішча, чым група сялян, працуючых цапамі. Твары сялян, працаваўшых ля малатарні, выяўлялі парыў. І пакуль я глядзеў на іх, мне ўспомніўся адзін стары-стары селянін (магчыма, гэта быў вясковы бажаводны), з якім мы гаварылі на дарозе. На запытаньне ці ня хоча ён урайсьці ў калектыў, ён адказаў, ужыўшы тэрмін Чырвонай Расіі, — «я лічу за лепшае заставацца аўтаномным». Так, бязумоўна, ён быў вар'ят».

Ці ня здасьца самому містэру Фарсону некалькі назручным зробленае ім пасьлясьпех абагуленьне пасьля гэтага «сакавітага» прызнаньня, што толькі вар'ят можа адмовіцца ад калгасу.

Але ў чым усё-ж такі прычына «цуда»? Над гэтым б'ецца, прабуючы разгадаць гэтае пытаньне, буржуазная мысьль. І на свой уласны жах, яна ўсё больш і больш, усё бліжэй і бліжэй прыходзіць да назнаньня сапраўднай прычыны, ад якой ёй хацелася-б адысьці, як-небудзь адчапіцца, як хочацца адысьці, адчапіцца ад сапраўднага вытлумачэньня сымптомаў і прымет захварэўшаму цяжкой, ракавой і ізьлеччай хваробай чалавеку.

«Тымы горькых истин нам дороже

Нас возвышающий обман».

Аднак, горкая ісьціна стукаецца, ломіцца ў дзьверы. Савецкі лад, дыктатура пралетарыяту, рэвалюцыйная сіла і магутнасьць новае ўзыходзячае клясы, што ідзе на зьмену гістарычна зжыўшаму сябе капіталізму,—вось крыніца ўсялякіх новых «цудаў».

«Ці тыя гэта людзі, якія стагодзьдзямі галадалі і ўсё-ж моцна чапляліся за свае індывідуальныя ўладаньні?» пытаецца зьдзіўлены малюнкамі калектыўнае працы М. Фарбман. «Цяпер яны, відавочна, задаволены тым, што калектывізавалі сваю працу. Яны ганараццца гэтай гарой збожжа, хаця немагчыма адрозьніць, дзе ўласьнасьць аднаго і дзе—другога.

Усякі, хто ведае, або думае, што ведае псыхалёгію рускага селяніна, будзе адмаўляць нават найменшую магчымасьць такой перамены. Але цяпер гэта перамена стала фактам. Ці гэта ілюзія, сон. Ці, магчыма, усё гэта разыграна лукавым урадам, цаною вялікіх страт, каб ашукаць яшчэ раз дзівакоў.

Я навінен прызнацца, што калі-б я ня бачыў гэтага сам, мне было-б надавычай трудна гэтаму паверыць. Я навінен таксама сказаць, што размаўляючы з селянамі, слухаючы іх гутаркі і прамовы, якія гаварацца імі на сходах, я часта ня верыў сваім вачом, я зьдзіўляўся іх розуму, яснай сьвядомасьці мэты і ўменьню выказваць свае думкі.

«...Відавочна, бесьсьвядомая сялянская Расія—гэта засяляўшая вялізарны прастор «дробная, шэрая бочая скацінка», як называлі калісьці рускіх сялян, абярнулася ў народ, які ўсьведамляе свае сілы і мэты, «Трактарыстыя — тыя-ж сяляне, і ўсё ж нечым яны адрозьніваюцца ад сялян». Больш самаўпэўненыя, больш дысцыплінаваныя. Больш шасьць з тых, з якімі я гутарыў, набывалі ўжо ў Чырвонай армії і далі мне магчымасьць яшчэ раз заўважыць у сваякасабістых лябараторыі Савецкай Расіі.

Паводле іх расказаў, сяляне атрымліваюць у армії рознастайныя тэхнічныя веды. На працягу 18 месяцаў, правед

ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ—ЛЕПШЫ ПАДАРУНАК XVI ПАРТЗЬЕЗДУ

ЗА „ЭНЭРГІЯЙ"—БАБРУЙСКІ КАМБІНАТ

Рапарт інжынэраў і тэхнікаў Сталінбуду

Рабочыя Бабруйскага камбінату павялічылі чэрвеньскую праграму і забавязаліся да XVI зьезду ЎсеКП(б) ліквідаваць прарывы. Сталінбуд дасьць першы ток не пазьней кастрычніка

Абяцаньні—даны. Чарга за канкрэтным іх ажыцьцяўленьнем

Рашучай барацьбой з недахопамі-ліквідуем прарывы

Рапарт рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу Бабруйскага камбінату XIII зьезду КП(б)Б

Рабочыя і тэхнічны пэрсанал узялі на сябе абавязацельства да XVI зьезду ЎсеКП(б) выканаць плян і ліквідаваць прарывы па асобных якасных паказальніках і сабекошце.

На сёньшні дзень вынікі работы камбінату наступныя: лесасэх выканаў вытворчую праграму па выпуску агульнай прадукцыі на 101 проц., а па выпуску экспартнай прадукцыі—на 80 проц. Фанэрны цэх выкапаў вытворчую праграму па выпуску агульнай прадукцыі на 110 проц. і па экспартнай—на 82 проц.

На чэрвень майскі плян павялічаем: па лесасэху на 3 проц., па фанэрным цэху—на 8 проц.

Рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал лічаць вынікі па экспарце і сабекошце нездавальняючымі і да XVI зьезду ЎсеКП(б) абяцаюць ліквідаваць прарывы ў гэтай галіне.

Да XVI зьезду ЎсеКП(б), датэрмінова на 10 дзён, пускаем у ход цэх будаўнічых дэталяй, а асноўны рабочы кадр абвяшчае сябе ўдарнікамі **імя XVI партыйнага зьезду.**

Да XIII зьезду КП(б)Б па камбінаце падана 120 заяў аб прыёме ў партыю. Рабочыя камбінату пастанавілі ў далейшым лепшых ударнікаў рэкамэндаваць у партыю Леніна.

Мы, рабочыя і адміністрацыйна-інжынэрна-тэхнічны пэрсанал зварачаемся да зьезду КП(б)Б з просьбай, пры абгаварэньні пытаньняў парадку дня зьезду зьвярнуць увагу на паступнае:

1. На тэхнічную дапамогу прадпрыемствам з боку вышэйшых гаспадарчых органаў, якая да гэтага часу нездавальняючая.

2. На большую ўвязку ў плянаваньні з боку вышэйшых гаспадарчых органаў і абавязковае папярэдняе абгаварэньне на рабочых сходах кантрольных лічбаў на 1930-31 год.

3. Паколькі Бабруйскі камбінат ужо налічвае каля 2.000 рабочых, а ў бліжэйшы час чакаецца яшчэ большае павялічэньне колькасьці рабочых, просім вырашыць пытаньне аб паскарэньні пабудовы клюбу.

4. Прымаючы пад увагу, што на Бабруйскі камбінат запрашаюцца з іншых месц кваліфікаваныя і некваліфікаваныя рабочыя, а таксама ўлічваючы востры жыльлёвы крызіс у Бабруйску, просім вырашыць пытаньне аб паскарэньні пабудовы кватэрнага дому для рабочых камбінату.

5. Просім таксама зьвярнуць увагу на паляпшэньне арганізацыі грамадзкага харчаваньня і больш плянавае забесьпячэньне з боку каапэрацыйных арганізацый.

Мы з свайго боку абавязваемся перад зьездам КП(б)Б, побач з выкананьнем прамфінпляну, павесьці бязьлітаспую барацьбу з прагуламі, са спэкуляцыяй на паных часовых труднасьцях.

Рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал Бабруйскага камбінату.

18 вагонаў і паравоз—падарунак XVI Зьезду партыі

25-га мая агульны сход рабочых вагонных майстэрань і дэпо Менскага вузла пастанавіў выпусьціць звыш пляну да XVI зьезду партыі з канвэнцыйнага рамонту 18 вагонаў і 1 паравоз.

Гэтай пастановай сход рабочых прыняў выклік газэты „Гудок" аб праве быць у чырвоным сьпіску, які будзе прадстаўлен ЦК саюзу чыгуначнікаў XVI зьезду ЎсеКП(б).

Бярэзінцы, прымайце выклік!

Другую дэкаду мая фабрыка «Чырвоная Бярэзіна» працуе пад знакам пералому. Бытворчая праграма па запалках выканана на 105,2 проц. супроць 104,8 проц. у мінулую дэкаду. Прадукцыйнасьць працы трохі падняслася: выпрацоўка ў чалавека - дзень складае 1.538 каробак супроць 1.528 у першую дэкаду. Значна падцягнуўся фанэрны цэх, які выканаў праграму на 105,7 проц. замест 92,6 проц. у першую дэкаду.

Адстаў толькі ватэрпасны цэх, які даў значнае зьніжэньне выпрацоўкі ў параўнаньні з першай дэкадай.

Аднак, ня гледзячы на гэтыя посьпехі, **тэмпы работы «Чырвонай Бярэзіны» яшчэ не забясьпечваюць ліквідацыі прарыву першага паўгодзьдзя.** Каб забясьпечыць ліквідацыю прарываў, «Чырвоная Бярэзіна», **пачынаючы з чэрвеня месяца,** павінна выконваць наступную месячную праграму мінімум: па запалках — **110 проц.,** па фанэрным цэху — **115 проц.,** па ватэрпасным — **110 проц.** Для гэтага адміністрацыі і фабрычным арганізацыям трэба неадкладна пераапрацаваць свой прамфінплян, разьмеркаваць недавыкананую колькасьць прадукцыі **на чатыры месяцы,** якія засталіся да канца гаспадарчага году, і **давесьці новы прамфінплян да кожнага варштату.**

Лепшым падарункам рабочых «Чырвонай Бярэзіны» XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б) будзе **пераход з 1-га чэрвеня на сапраўды ўдарныя тэмпы работы.**

Мы заклікаем рабочых, заводзкія арганізацыі і адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал «Чырвонай Бярэзіны» пасьледаваць прыкладу рабочых кацельнага цэху заводу «Энэргія» і Бабруйскага камбінату, якія рыхтуюць XVI партзьезду бальшавіцкі падарунак, — ліквідацыю прарываў і перавыкананьне прамфінпляну.

Брыгадзір «Зьвязды» ШАЎКАВЕЦ.



На здымку: галоўны корпус Асінаўскай электрастанцыі імя т. Сталіна.

Асноўныя будаўнічыя работы скончаны

Інжынэры і тэхнікі Сталінбуду—Аршанскай канфэрэнцыі

ВОРША, 25. (Наш спэц. кар.). 60 інжынэраў і тэхнікаў **СТАЛІНБУДУ** (будаўніцтва дзяржаўнай раённай электрастанцыі імя Сталіна) у прывітальным рапарце далажылі акруговай партыйнай канфэрэнцыі аб становішчы работ на будаўніцтве.

— Галоўны корпус Сталінбуду, — гаворыцца ў прывітальным рапарце, — скончан. Закончана будаўніцтва каналаў і лініі перадачы на **Дуброўну.** Грунтоўныя работы на жыльлёвым будаўніцтве скончаны. 1.500.000 пудоў торфу чакаюць у станцыі пачатку эксплёатацыі. Канчаецца мантаж першага турбагенэратара. Усе часткі другога турбагенэратара прыбылі і чакаюць мантажу. Скончан мантаж першага катла, у паяўнасьці ёсьць усе часткі трэцяга катла, пачынаецца мантаж другога катла. Часткова атрымана высокавольтнае электра-абсталяваньне. Трансфарматары перайшлі мяжу. Для падачы энэргіі **Шкловy, Магілеву і Віцебску** ёсьць у патрэбнай колькасьці алюміні і медзь. Скончаны ўсе будаўнічыя работы па надстанцыях. Мантаж выкапан на 75 проц. Пачалі працаваць дзесяць торфаманшын і ў гэтым годзе яны дадуць яшчэ 3.500.000 пудоў торфу. У асноўным работы на будаўніцтве скончаны. Але часткі мантажу, якія яшчэ засталіся, зьяўляюцца вельмі адказнымі і трудными. Нас гэтыя труднасьці не палохаюць.

— Калектыў Сталінбуду прымае ўсе меры да таго, каб агульнымі сіламі **выканаць поўнасьцю праграму будаўніцтва. Цьвёрдая ўпэўненасьць у тым, што станцыя будзе пушчана ў кастрычніку гэтага году, цесна згуртавала спэцыялістых з рабочай масай Сталінбуду.**

— Сталінбуд — энэргетычная база **Аршаншчыны, Віцебшчыны і Магілеўшчыны — павінен быць і будзе пушчан у кастрычніку.** Прамысловасьць і сельская гаспадарка гэтых округ чакаюць пуску Сталінбуду. Мы гэта ведаем і з упэўненасьцю заяўляем, што сваё заданьне **вялікая** гаспадарчая **узмоцніць** сацыяліства і вызначыць дальнейшыя шляхі нашай работы.

— Мы, інжынэры і тэхнікі Сталінбуду, лічым, што ёсьць шлях да шкоднага балота. Мы лічылі, што адзіна правільны шлях да сацыялістычнай генэральная лініяка камуністычнай партыі. Толькі цяўленьне генэральнай лініі партыі дасьць магчымасьць ажыцьцявіць наказ Ільліча і перагнаць...

Пад кіраўніцтвам лініі партыі мы, інжынэры і тэхнікі Сталінбуду, лічым, што ў рэальных бакі ад **чай клясай** дабяромся выкананьня пяцігодкі **за чатыры** гады.

— **Сталінбуд будзе пушчан у кастрычніку.**

На пераклічку!

У сацыялістычную пераклічку на ліквідацыю прарываў да партыйных зьездаў уключыліся і рабочыя Бабруйскага камбінату.

25-га мая на сходзе рабочых камбінату выступіла дэлегацыя рабочых ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА, якая перадала рабочым камбінату выклік на сацпераклічку.

У сваёй пастанове рабочыя камбінату прынялі выклік швэйнай фабрыкі і ў сваю чаргу выклікалі рабочых бабруйскага ЧЫГУНА-ЛІЦЕЙНАГА ЗАВОДУ ІМЯ СТАЛІНА і менскія прадпрыемствы — ЗАВОД «ЭНЭРГІЯ» І ШВЭЙНУЮ ФАБРЫКУ «КАСТРЫЧНІК».

Выпучана дэлегацыя для ўдзелу ў сходзе рабочых чыгуналіцейнага заводу.

Рабочыя фанэрнага цэху камбінату абавязаліся ДА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б:

1. Датэрмінова выканаць поўнасьцю вытворчую праграму за май.
2. Выпусьціць 800 куба-мэтраў фанэры.
3. Арганізаваць 5 ударных брыгад імя XIII зьезду КП(б)Б.

ДА XVI ЗЬЕЗДУ ЎсеКП(б) рабочыя абавязаліся:

1. Ліквідаваць прарывы па ўсіх паказальніках.
2. Выканаць прамфінплян як у колькасным азначэньні, так і ў якасным.
3. Узмоцніць працдысцыпліну.
4. Давесьці брак да мінімуму.
5. Ачысьціць ударныя брыгады ад інжэ-ўдарнікаў.

А. МАГІДАЎ.

ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІКІ—У ПАРТЫЮ

На Бабруйскім камбінаце за апошні час павялічыўся прыліў заяў у партыю. Да акруговай партканфэрэнцыі падана 120 заяў. Сярод аўтараў заяў—многа рабочых з вялікім вытворчым стажам.

Тав. ВАЙСМАН — рабочы фанэрнага цэху Бабруйскага камбінату, з вытворчым стажам 37 год — падаў заяву аб уступленьні ў партыю.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА НЕ ПАВІННА ЗАСТАЦЦА НА ПАПЕРЫ

Якасныя паказальнікі выкананьня прамфінпляну па Бабруйскім камбінаце за красавік і даныя аб выкананьні прамфінпляну **ў першай палове мая** кажуць аб тым, што рэальная пагроза прарыву яшчэ не прайшла.

Сабекошт куба-мэтру піламатар'ялаў па лесасэху ў красавіку складаў 4 р. 70 кап., супроць **4 р. 15 кап. у сакавіку.** Павялічэньне сабекошту часткова тлумачыцца рамонтам цэху, але ўсё-ж цэхавыя арганізацыі мала зрабілі для зьніжэньня сабекошту.

Сабекошт куба-мэтру фанэры ў красавіку складаў 78 р. 95 кап.—**на 15 руб. 95 кап. вышэй плянавага заданьня.**

Ня гледзячы на рост выпуску прадукцыі, цэхавыя выдаткі ў красавіку **не паменшыліся.**

Колькасныя паказальнікі за першую палову мая паказваюць наступнае: лесасэх **недавыканаў** сваю праграму на 0,5 проц., фанэрны цэх **перавыканаў** яе на 6 проц.

Галоўная хіба камбінату—прастоі, якія на лесасэху дасягаюць 16 проц. Напрыклад, 17 мая ў фанэрным цэху амаль цэлую зьмену прастаялі сушыльныя апараты. Пры наяўнасьці належнай распарадчасьці, гэты прастой можна было-б абмежаваць некалькімі гадзінамі. Таксама многа прастоіў бывае па прэсах, рабочыя якіх мала знаёмы з сыстэмай параправодаў.

Рабочыя камбінату ўзялі на сябе абавязак да XVI партыйнага зьезду ліквідаваць усе прарывы. Гэты абавязак **не павінен застацца на паперы.**

Брыгада «Зьвязды»:
А. Магідаў, Дзеляндоў.

Зьнішчыць бясплянавасьць

Ня гледзячы на недавыкананьне вытворчай праграмы за 7 месяцаў на 3 77 проц., першыя дзьве дэкады мая на заводзе «Энэргія» паказваюць некаторае зьніжэньне тэмпаў выкананьня прамфінпляну.

Калі ў красавіку праграма вагавога цэху была выканана на 123,09 проц., то за першыя дзьве дэкады мая праграма выканана на 110,99 проц. Заданьне на вырад вагі ў 100, 400 і 750 кілёграм зусім ня выканана. Тлумачыцца гэта тым, што Сьмілавіцкі рафкамбінат, які павінен быў зрабіць для гэтых вагаў драўляныя часткі, ня выканаў заказу заводу.

Ліцейны цэх замест 90,10 проц. у красавіку, выканаў праграму за першыя дзьве дэкады толькі на 81 56 проц. Значная частка віны падае на Белмэталяаб'яднаньне, якое не прадаставіла заводу заказу на запасныя часткі да камендрабілак. Заказ павінен быў быць прадастаўлен не пазьней 10 мая, але не прадастаўлен і па сёньшні дзень. Другой прычынай недавыкананьня праграмы ліцейным цэхам зьяўляецца рост браку — замест 7,89 проц. у красавіку — 9,19 проц. за першыя дзьве дэкады (а паводле пляну—5 проц.). У павялічэньні браку вінавата як адміністрацыя, так і самі рабочыя, якія нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў. Так, з усяго браку — 1.055 кілёграм атрымалася па віне адміністрацыі і 19.338 кілёграм па віне рабочых.

Мэханічна-кацёльны цэх замест 96,81 проц. праграмы ў красавіку, даў за першыя дзьве дэкады мая 94,46 проц. Але ў гэтым цэху другая бяда. З прычыны адсутнасьці некаторых нескладаных дэталяй, затрымліваецца выпуск радыя машын і варштатаў. Так, калі праграма па мэханічна-кацёльным цэху ў грашовым азначэньні выканана на 94,46 проц., то ў колькасным азначэньні праграма выканана толькі **на 37,48 проц.** Гэта ўжо тлумачыцца выключна бясплянавасьцю кіраўніцтва адміністрацыі, якая ў плян работы мэханічнага цэху ня ўключыла дэталяй да машын. Мы на гэту памылку паказвалі і раней, але да гэтага часу яна ня выпраўлена.

Трэба адзначыць, што з двух цэхаў—мэханічнага і кацёльнага — апошні працуе значна лепш. Працдысцыпліна ў ім значна вышэйшая. Таму ён першым і заключыў гаспадарча-палітычны дагавор з адміністрацыяй на перавыкананьне праграмы на 5 проц. да XVI зьезду ЎсеКП(б).

Іншыя цэхі павінны ўзяць прыклад з кацёльнага і таксама перайсьці па ўдарныя тэмпы работы.

Брыгада «Зьвязды»:
БРАЙНІН, ПАЛІЧАНСКІ.

Мітынг на заводзе «Энэргія», на якім рабочыя заводу абвясьцілі сябе мабілізаванымі для ліквідацыі прарываў у прамфінпляне да XVI зьезду партыі.

У 1930-31 г. ліквідаваць няпісьменнасьць

На апошнім пасяджэньні прэзыдыум ЦВК БССР заслухаў даклад Наркамасьветы і суседклад ЦС т-ва «Прэч Няпісьменнасьць» аб выкананьні дырэктыў ураду па пытаньні ліквідацыі няпісьменнасьці. За 1929-30 год арганізавана каля 10.000 ліквпунктаў і школ, якімі ахоплена 250.000 няпісьменных і малапісьменных — у два разы больш, чым за 1928-29 год. Агульны лік няпісьменных ва ўзросьце ад 12 да 45 год зараз складае 633.984 чал., або 23 проц. у адносінах да насельніцтва паказанага ўзросту. Плянам на 1930-31 год прадугледжана ліквідацыя няпісьменнасьці сярод членаў прафсаюзаў ва ўзросьце ад 12 да 50 год. сярод усяго астатняга насельніцтва ва ўзросьце ад 12 да 45 год.

Прамфінплян—да кожнага варштату

Першыя вынікі налёту

Дырэктыва аб давядзеньні прамфінпляну да варштату ня выканана

Першыя вынікі налёту на прадпрыемствы з мэтай праверкі — ці даведзены прамфінплян да варштату, паказваюць, што «Зьвязда» не памылялася, завастраючы гэта пытаньне перад пралетарскай грамадзкасьцю. Ня гледзячы на тое, што дырэктывы аб давядзеньні прамфінпляну да варштату былі даны ўжо даўно, гэтае важнейшае мерапрыемства, якое зьяўляецца **лепшай гарантыяй выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну,** па большасьці прадпрыемстваў у жыцьцё не праведзена. У сваё апраўданьне адміністратары і заводзкія арганізацыі, зразумела, высоўваюць розныя «аб'ектыўныя» прычыны, з якіх асноўнай зьяўляецца, як быццам, немагчымасьць ва ўмовах дапага прадпрыемства давесьці прамфінплян да варштату. Гэта сьведчыць аб тым, што мы тут маем справу ня толькі са звычайнай нядбайнасьцю, а проста са сьвядомым ухіленьнем ад выкананьня важнейшай дырэктывы.

На гарбарні **«Бальшавік»,** дзе **прамфінплян да варштату не даведзены,** загадчык плянавага аддзелу тав. **Аксэльрод** для свайго апраўданьня знайшоў тысячу прычын. Бачыце, пасьля першай канфэрэнцыі ўдарнікаў, ён пачаў даводзіць прамфінплян да кожнай брыгады. Заказалі нават 100 рамак, у якіх меркавалі вывешваць пляны. Рамкі рабіліся **два месяцы,** а калі іх зрабілі, агледзеліся, што бяз шкла пляны могуць заныліцца. Тады заказалі для кожнай рамкі шкло. Гэты заказ таксама выконваўся цэлы **месяц...** Вось прычыны, чаму на гарбарні «Бальшавік» прамфінплян да варштату не даведзены.

Між іншым, што хацелі кіраўнікі плянавага аддзелу вывешваць у гэтых рамках пад шклом? А вось што. Паводле слоў тав. Аксэльрода, плянавы аддзел думаў кожныя 5 дзён **падагульваць вынікі работы кожнай брыгады** і гэтыя вынікі вывешваць у рамках. Такім чынам, плянавы аддзел меркаваў давесьці прамфінплян (!) да кожнага варштату. **Што агульнага мае гэтае мерапрыемства з давядзеньнем заданьняў да варштатаў?** Здаецца ніякага. Але плянавы аддзел думаў гэтым задаволіцца.

На заводзе **«Энэргія»,** дзе плянавыя заданьні ня толькі не даведзены да варштатаў, але нават **некаторыя цэхі прамфінпляну зусім ня маюць,** тэхнік плянавага аддзелу т. **Ерынгроз** скардзіцца:

— Мы ўсе сілы палажылі, каб давесьці плянавыя заданьні да рабочых. Але што мы можам зрабіць, калі нічога не атрымліваецца...

Можна сабе ўявіць, якімі мэтадамі гэта работа праводзілася, што нічога не «атрымалася». Пры такоў устаноўцы плянавага аддзелу, нічога дзіўнага, што дырэктар заводу т. **Атрошка** ўпэўнены, што прамфінплян да варштату ва ўмовах заводу «Энэргія» можна давесьці толькі тэарэтычна, а не практычна.

На дражджавым заводзе **«Чырвоная Зара»** дырэктар заводу тав. **Плоткін** знайшоў зусім «асаблівую» прычыну:

— Завод працуе выключна для збыту, сколькі заказваюць, столькі ён і выпрацоўвае...

Але і гэта апраўданьне ня зусім удалае. Бо нават і повялікую праграму, і праграму «паводле заказу» можна давесьці да кожнага варштату.

Налёт на заводзе **«Камунар»** быў праведзены пасьпех. Тры «лёгкія кавалерыстыя» па чале з кансультантам штабу тав. Васілеўскім прайшліся па цэхах і запісалі, што чулі. Ніякай падрыхтоўкі праведзена ня было, ударнікі ў праверку ня былі ўцягнуты. Зразумела, што вынікі налёту не даюць поўнага малюнку становішча з давядзеньнем прамфінпляну да варштату. Але тое, што выяўлена, даволі выразна сьведчыць аб недахопах у гэтай галіне. Галавы прамфінплян даведзены **толькі да кожнага цэху.** Здараецца, што вытворчае заданьне даецца часамі майстру па месяц. **Але да асобных брыгад, агрэгатаў і варштатаў заданьні не даведзены** (за выключэньнем кавальскага цэху, дзе заданьні даюцца намесячна кожнаму варштату). Узік работы вядзецца толькі па цэхах, намесячна. Але такая пастаноўка растлумачальнай работы паўкола прамфінпляну цікога ня можа задаволіць. Хто-ж канкрэтна ў гэтым вінаваты? На жаль, удзельнікі налёту на гэта адказаць ня могуць...

Мы ўзялі для прыкладу чатыры найбольш буйныя ў Менску прадпрыемствы. Вынікі налётаў ня прынесьлі для нас нічога нечаканага. «Зьвязда» ўжо многа раз сыгналізавала аб гэтым буйнейшым недахопе ў рабоце нашых прадпрыемстваў — аб недавядзеньні прамфінпляну да варштатаў. У прыватнасьці, мы некалькі разоў паказвалі на гэты недахоп на гэтых 4-х прадпрыемствах.

Патрэбны, відаць, больш рашучыя меры, каб прымусіць заводзкіх адміністратараў выконваць дырэктывы вышэйшых органаў.

М. Ц.

Сталінбуд—сёньня

Маленькая станцыя (раней разьезд) **Хлюсьціна,** якая знаходзіцца за паўтары дзесяткі кілёмэтраў ад **Воршы,** па дарозе з Менску ў Маскву, стала настолькі значнай, што нават скорыя цягнікі пачалі на ёй спыняцца. Ад гэтай станцыі пайшла ветка на Выдрыцу і Арэхі, дзе будуецца Сталінбуд.

Сталінбуд—энэргетычнае сэрца Беларусі—мае крыніцаю харчаваньня два цэнтры: тарфяныя распрацоўкі ў **Шабанах,** возера **Арэхі.** Сталінбуд будзе паглынаць у адну гадзіну больш вады, чым увесь горад Менск за цэлыя суткі.

З тарфянымі распрацоўкамі Сталінбуд злучаны вузкакалейкаю. Ужо зроблен поўтадовы запас паўдзі, які высіцца гарою ў невялікай адлегласьці ад электрастанцыі.

Возера Арэхі, апярэзанае з усіх бакоў маладым лесам, займае прасторы на 5 кілёмэтраў у даўжыню і на поўкілёмэтра ўшыркі. Яго воднай паверхні хопіць на тое, каб забясьпечыць вадой і будаўніцтва другое чаргі і нават трэцяй чаргі.

З возера да станцыі ідзе канал даўжынёю ў $^3/_4$ кілёмэтра, забясьпечваючы станцыю вадою. Канал паглыбляецца ля возера на 200 мэтраў. Гэта частка каналу зьяўляецца галоўнай часткай Сталінбуду. Тут яшчэ трэба правесьці шмат работы па ачыстцы дна каналу ад зямлі. Неабходна будзе выбраць каля 1.500 куба-мэтраў зямлі пад вадой.

Неабходна адзначыць, што грунт, па якім пракладзен канал, багаты раўчакамі і крыніцамі, якія прабіваюцца нават скрозь бэтоннае дно каналу, выклікаючы гэтым у будаўнікоў прыкрасьць і лішнія страты на заглушэньне іх. Наогул грунт, на якім стаіць станцыя, багаты падгрунтовымі водамі, што назіраецца і зараз пры правядзеньні земляных работ. Гэта акалічнасьць нават ставіць у парадак дня пытаньне аб дрэнажы мясцовасьці вакол станцыі і адводзе вод.

Інжынэр **Вішняк,** які вядзе мантаж установак Сталінбуду, адзначае, што работу прыходзіцца весьці ў адну зьмену з-за недахвату раду матар'ялаў. Мы і самі бачылі гэта. Акумулятарнае памяшканьне гатова, але няма медзі, каб абсталяваць яго ў сярэдзіне. Памяшканьне, якое зьяўляецца нібы капітанцкім мосьцікам кіраўніцтва станцыі, таксама ня можа быць закончана, ня гледзячы на тое, што жалезны шклет гэтага шчыту ўжо гатовы. Тут работа ўперлася ў недахват мармуру і часткова апаратуры.

Замежныя фірмы, якія забясьпечваюць Сталінбуд патрэбным абсталяваньнем, да апошняга часу выконвалі тэрміны паставак акуратна, але з мая месяца ўжо назіраецца затрыманьне. Варта адзначыць, што на усім будаўніцтве працуе адзін чужаземец, які мантыруе турбагенэратар. Усе работы выконваецца нашымі спэцыялістамі.

Нас прывяла ў захапленьне якасьць бэтону на будаўніцтве, які не патрабуе месцамі штукатурыцца — да таго ён акуратна выкананы. Цагляная кладка з сілікатнай цэглы таксама вялікая глядзець.

Пры адносінах да канчаткі ўсіх форм станцыі, якія знаходзяцца ў парадку, выгляд, унутры будынку яшчэ ёсьць многа работы.

У машыннай залі для двух турбагенэратараў, якія ўжо ў тошкі гатовы фундаманты, гэтыя адзначаюцца надзвычайнай прастатой, прадстаўляючы сабою жалезабетонную пліту з 4 лежамі, злучанымі з фундаментаў ужо багенэратар вялікай вейшай канструкцыі.

Да апбудовы остатарай, фундаментаў (торф) з дапамогай, якія будзе накіроўваецца, ня прыступлена.

Шчыльна да будынку станцыі датыкаецца разьмеркальная будыніна, з якой ток у 6.600 вольт будзе пераўтворацца да напружаньня у 3.300 вольт.

Будыніна, прызначаная ток да напружаньня у 10.000 вольт, прадстаўляе сабой асаблівае. Гэта ня будыніна ў тым сэнсе, як мы прывыклі разумець, гэта-ж, зробленая з жалезабетонных шчытоў, якія ажыцьцяўляецца простымі ў паветры, бяз сьцен.

Лініі перадачы, якія разьмеркавальных будынкаў ад размеркальных бакі ад значаюцца сваімі фігур іх паветраных падпор (слупоў).

Наогул работы вельмі шмат. Труднасьці, што ўзьнікаюць на шляху будаўніцтва, змогуць быць пераможаны намаганьнямі рабочага і тэхнічнага складу будаўніцтва, пры падтрыманьні адпаведных інстанцый.

ЗОДЧЫ.

На здымку: падстанцыя на Сталінбудзе.

Зоатэхнічную ВНУ трэба будаваць у Менску

(У парадку абгаварэньня)

У БССР уже больш за 50 сьвінагаспадарак, мыслёвых гаспадарак, рад малочных фермаў з тысячнымі кароў і г. д. Для тысячы лазей, якія-б маглі арганізаваць сваю справу і весьці яе.

У тэзісах т. Яўлева да XVI зьезду партыі гаворыцца, што трэба паставіць спраўу па сьвінагадоўлі так, каб у 1932-33 годзе дасягнуць 7.000.000 таварных сьвіней. Гэта патрабуе ўжо ў бягучым годзе ўкладаньня 300 мільёнаў руб. па Усім Саюзе. Як відома, амаль 40 проц. гэтых укладаньняў прыпадае на БССР. Перад намі буйнейшая ня толькі гаспадарчая, але і палітычная задача: трэба жыцьцяўлянць гігантыдзкі плян разьвіцьця жывёлагадоўлі, якога ня бачыла яшчэ гісторыя.

Каб падрыхтаваць патрэбныя кадры, неабходна адкрыць зоатэхнічную ВНУ, як самастоятную установу. Такую ВНУ намечана ІКЗБ і адкрыць у Менску з прыёмам у першы год 250 асоб. Відаць, з будучага году неабходна будзе прыняць 1.000 асоб. А то і больш. Тэмпы разьвіцьця жывёлагадоўлі гэтага патрабуюць. Бясспрэчна, аднак, што такую колькасьць спэцыялістых немагчыма падрыхтаваць без належнай базы ў выглядзе спэцыялізаваных гаспадарак.

Аб неабходнасьці стварэньня ў БССР зоатэхнічнага інстытуту газэта Соцыялістическое Земледелие» ад 23-га мая 1930 году пісала: «Неабходна з новага навучальнага году адкрыць ня менш трох сьвінаводчых ВНУ, разьмясьціўшы іх па асноўных сьвінаводных раёнах: на Украіне, у Беларусі, для РСФСР у Маскве і ня менш 13 тэхнікумаў».

Прафэсар Архіпаў, ВНУ раіць зьліць зоатэхнічную ВНУ з ВНУ, між іншым, з вэтэрынарнай на тэй, між іншым, з вэтэрынарнай на падставе, што ў Маскве ёсьць зоатэхнічна-вэтэрынарная ВНУ. Між тым, работа гэтага ВНУ паказала, што яна ня жыцьцяздольна. Зараз яна рэарганізавана ў рад спэцыяльных ВНУ: буйнос, рагатае жывёлы, сьвінагадоўлі і г. д. У іншых рэгіёнах таксама ўсе вэтэрынарна-зоатэхнічныя ВНУ рэарганізаваны. Праф. Аляксеў, ВНУ бярэ кірунак на падрыхтоўку ня ўсіх спэцыялістых, а зоацыклёпэдыстых.

Зусім зразумела, што патрэбны зоатэхнікі вузкай спэцыяльнасьці па сьвінагадоўлі, на малочнай справе і г. д.

Такія спэцыялісты павінны ўмець арганізаваць буйную спэцыялізаваную жывёлагадоўчую гаспадарку і ёю кіраваць ня толькі карміленьне жывёлы і расплод, але і ўсю біялёгію жыцьця жывёлы ў вялікім стадзе і групах. Падобна-ж думкі праф. Архіпава, той зоатэхнік, хто будзе ведаць анатомію жывёлы і як яе падлячыць. Гэта трэба адкінуць. Неабходна зараз-жа арганізаваць спэцыяльную зоатэхнічную ВНУ, якая ў далейшым будзе падзелена на ВНУ: сьвінагадоўчую, малочнай жывёлагадоўлі, мясной справы і г. д.

Праф. Аляксеў, а Горак, як палявод, абараняе застаўленьне зоафаку ў Горках. Ён, між іншым, ні аднаго слова не гаворыць аб тым, **чаму ў Горках да гэтага часу зусім не падрыхтоўваліся і ня рыхтуюцца зоатэхнікі, а выпускаюцца толькі паляводы.**

Праф. Аляксеў даводзіць неабходнасьць падрыхтоўкі жывёлаводаў, з ухілам у расьлінаводзтва, гэта значыць— зноў эпцыклёпэдыстых. Розьніца паміж ім і праф. Архіпавым тая, што апошні раіць рыхтаваць зоатэхнікаў з вэтэрынарным ухілам.

Ад пераводу з Горак зоатэхнічнага факультэту ў Менск, акадэмія не праіграе, і сапраўды зоатэхнія выяўляецца ў тым, што там ёсьць тры пакойчыкі і... ніякае базы. Акадэмія будзе існаваць, як і існавала, рыхтаваць паляводаў розных спэцыяльнасьцяй, як і рыхтавала, без зазначаных трох габінэтаў.

Разьмяшчаць-жа новую зоатэхнічную ВНУ ў Акадэміі абсалютна няма дзе. Акрамя таго, там няма ніякай базы ў выглядзе спэцыялізаваных малочных гаспадарак, халадзільнікаў і інш. устаноўак. Для ўсяго гэтага патрэбны мільёны сродкаў. Да таго-ж няма ніякага сэнсу будаваць у Горках буйнейшыя малочныя гаспадаркі і г. д., бо прадукцыі для перапрацоўкі там няма і збыту таксама ня будзе. Зусім зразумела, што больш мэтазгодна скарыстаць ужо набудаваныя ў буйных гарадох, як у Менску, халадзільнік, малочныя, сьвінагадоўчыя, птушыныя і інш. базы. Што датычыць памяшканьня, то ўся зоатэхнічная ВНУ можа цалкам разьмясьціцца ў памяшканьнях выстаўкі.

Для БССР патрэбны тысячныя кадры зоатэхнікаў. Іх можна рыхтаваць толькі ў зоатэхнічнай ВНУ, як гэта зроблена па ўсім СССР, а не пры вэтэрынарных і агранамічных (паляводчых) ВНУ. З падрыхтоўкай кадраў па жывёлагадоўлі наўрад ці здолее справіцца адна акадэмія.

Чаму лепш за ўсё адкрыць зоатэхнічную ВНУ ў Менску! Таму, што тут ёсьць базы для навучаньня студэнтаў, **як цэнтральная сьвінагадоўчая станцыя, коштам у 300 тыс. руб., птушыныя і трусовыя гаспадаркі кожная каля 300.000 руб. Зараз арганізуецца станцыя малочнай сьвінагадоўлі і г. д. Ёсьць бойня, халадзільнік, буйная малочная, рыбныя сажалкі, усё гэта коштам у некалькі мільёнаў рублёў. Таксама ёсьць на выстаўцы мэханізаваныя двары для жывёлы, завод камбікармоў, мэханізаваныя малочныя** і г. д. Усяго гэтага няма ні ў якім іншым месцы. Наўпасьць у Менску НДІ, БДУ і БАН дае магчымасьць у гэтым-жа годзе адкрыць усе курсы зоатэхнічнага інстытуту з вельмі нязначнымі сродкамі ў добрых абставінах, і такім чынам, даць дзяржаве ў самы кароткі тэрмін тысячы так патрэбных зоатэхнікаў розных спэцыяльнасьцяй для перабудовы ўсяе сельскае гаспадаркі БССР на базе буйных спэцыялізаваных жывёлагадоўчых гаспадарак.

Дырэктар цэнтральнай дасьледчай сьвінагадоўчай станцыі С. ЖУРЫК.

Народны Камісарыят Асьветы БССР і праўленьне Дому Пісьменьніка наладжваюць юбілейны вечар, прысьвечаны 25-цігадовай літаратурна-мастацкай дзейнасьці народнага паэты Беларусі Янкі Купалы.

ПРАГРАМА ВЕЧАРУ:

1. Уступнае слова Наркамасьветы т. **Платуна.**
2. Даклад аб творчасьці Янкі Купалы (праф. **Піотуховіч**).
3. Прывітаньні.
4. Успаміны і чытка пісьменьнікамі твораў, прысьвечаных юбіляру.
5. Мастацкая частка — выкананьне твораў юбіляра, пакладзеных на музыку.

Вечар адбудзецца 28 мая ў Доме Асьветы (Камуністычная. 19).

Пачатак пунктуальна а 8-й гадз. увечары.

Уваход па запрашальных білетах.

МЕНСК

Дзіцячая дэманстрацыя

25 мая ў Менску адбылася агульна-гарадзкая дэманстрацыя піянэраў і школьнікаў, прысьвечаная Міжнароднаму Дзіцячаму Тыдню. У дэманстрацыі прымала ўдзел каля 12.000 піянэраў і школьнікаў.

Дэманстрацыя праходзіла пад лёзунгам падрыхтоўкі да міжнароднага дзіцячага кангрэсу, падваеньня радоў піянэраў і сувязі з дзецьмі замежных краёў, выкананьня прамфінпляну, выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады і барацьбы за калектывізацыю.

У часе дэманстрацыі быў таксама арганізаваны дзіцячы карнавал, у якім адбіваліся ўсе лёзунгі дзіцячага міжнароднага тыдню. Была выстраена міжнародная калёна, якая выяўляла сабою нацыянальнасьці ўсяго сьвету.

Наданьне годнасьці гэроя працы

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў надаць годнасьць гэроя працы тав. ГАРБАЧЭНКУ П. М. Тав. Гарбачэнка, рабочы з 42-гадовым працоўным стажам, у сучасны момант працуе машыністам на параходзе. Тав. Гарбачэнка мае рад рэвалюцыйных заслуг, а таксама заслугі на працоўным фронце.

Курсы па падрыхтоўцы кадраў патрабуюць увагі

На фронце падрыхтоўкі кадраў ёсьць прарывы, якія зьяўляюцца вынікам слабай увагі да існуючых курсаў па падрыхтоўцы кадраў. Так у нас існуюць курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ. Навучальная частка там пастаўлена дрэнна. Бываюць выпадкі, калі настаўнікі не зьяўляюцца на лекцыі, у выніку чаго зрываюцца заняткі. Няма падручнікаў, што не дае магчымасьці курсантам-рабочым падрыхтавацца да заняткаў.

Асабліва дрэнная справа з беларусізацыяй. Большасьць настаўнікаў выкладаюць на расійскай мове, бо так «больш зразумела рабочым курсантам» (з матываў выкладчыкаў).

Яшчэ горшая справа з курсантамі пры БДУ па падрыхтоўцы на рабфак. Там з 60 курсантаў зараз засталося ўсяго 20 чалавек, якія таксама неакуратна наведваюць курсы.

Прычыны распаду курсаў зусім простыя. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі БДУ зусім мала займаліся гэтым пытаньнем, не клапаціліся забясьпечыць патрэбу курсаў.

Зараз засталіся тры месяцы да новага навучальнага году. Патрэбна хоць зараз зьвярнуць увагу на падрыхтоўчыя курсы — стварыць патрэбныя ўмовы працы, забясьпечыць падручнікамі. Неабходна таксама адмовіцца ад існуючай думкі, каб распусьціць курсантаў на месячныя канікулы, гэтым самым створыцца сур'ёзная пагроза, што ня будзе выкапан навучальны плян.

КУРСАНТ.

НАЗНАЧЭНЬНІ

Тав. **Машкін** назначан упоўнаважаным Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфаў СССР пры СНК БССР, тав. **Каменеў** — намесьнікам упоўнаважанага.

РАБОЧЫ-ЧЫГУНАЧНІК—НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ДЗЯРЖПЛЯНУ

Тав. ПЯТРЫКЕВІЧ, памочнік майстра Гомельскага вузла, назначан намесьнікам старшыні Дзяржпляну БССР.

Тав. ПЯТРЫКЕВІЧ скончыў курсы рабочых-выпучэнцаў пры ЦК КП(б)Б.



На дзіцячай дэманстрацыі.

ЗА НЯДБАЙНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ЗБОРУ ПОНЕЛУ — ВЫМОВА

За нядбайныя адносіны да збору понелу ад школ г. Менску (па 4 школе) НК РСІ паставіла на від праўленьню райкалгасаюзу, а адказнаму выканаўцы **т. Пляцько** абвясьціла вымову.

Апрача таго, прапанавана райкалгасаюзу тэрмінова ўрэгуляваць і наладзіць тэту справу.

Працоўную беднату ўцягнуць у саматужныя і с.-г. арцелі

Няправільна вычышчаных— аднавіць на рабоце

Прэзыдыум ЦВК БССР па дакладу пацкамісіі аб мерапрыемствах па ўцягненьні ў вытворчую працу яўрэйскай беднаты і беднаты іншых нацыянальнасьцяй прыняў наступную пастанову.

Пры камплектаваньні саматужных арцеляй і с.-г. калектываў, уцягваць у першую чаргу працоўную беднату, а таксама наступныя групы яўрэйскай беднаты і беднаты іншых нацыянальнасьцяй, страціўшых выбарчыя правы, як дробныя гандляры:

1) Бядняцкія элемэнты з удзельнікаў грамадзянскай вайны і былыя чырвонаармейцы, страціўшыя выбарчае права з прычыны дробнага гандлю і сем'і гэтых удзельнікаў грамадзянскай вайны і забітых на вайне.

2) Бядняцкія сем'і асоб, забітых і цяжка параненых у часе контр-рэвалюцыйных пагромаў.

3) Тую частку беднаты, якая пазбаўлена выбарчых правоў за заняткі ў мінулым гандлем па патэнце першага разраду, калі яны пакінулі займацца гандлем на працягу апошніх 6 месяцаў.

4) Тую частку беднаты, якая ў мінулым займалася гандлем па патэнце 2-га разраду і нарвала з гандлем на працягу апошняга году.

Гэтыя-ж групы павінны быць заразжа дапушчаны да ўсякага роду сэзонных работ. Пералічаныя групы не дапускаюцца ў склад выбарчых органаў саматужных арцеляй і с.-г. калектываў у тым выпадку, калі яны пазбаўлены выбарчых правоў.

Бядняцкія элемэнты з былых удзельнікаў грамадзянскай вайны, страціўшыя выбарчыя правы з прычыны дробнага гандлю, паллягаюць рэгістрацыі на Біржы Працы.

Вычышчаныя са складу арцеляй і калектываў, або зьнятыя з працы асобы з паказаных катэгорый, павінны быць зараз-жа адноўлены.

Наркамасьветы зрывае работу па арганізацыі ВТНУ

У пастанове СНК аб арганізацыі політэхнічнага інстытуту ў Менску прапануецца Наркамасьветы неадкладна адвесьці патрэбныя памяшканьні ў будынках БДУ для разгортваньня работы ВТНУ. Месяц таму назад, калі прадстаўнік ВТНУ зьвярнуўся да рэктара з просьбай зараз-жа вызначыць некалькі пакояў для арганізацыі лябараторый і для наладжаньня работы апарату быў атрыманы наступны адказ: «Зьвярнецеся ў Наркамасьветы».

А ў Наркамасьветы нарашылі: «ВТНУ яшчэ няма,—значыць няма чаго адводзіць памяшканьне». На думку Наркамасьветы выходзіць, што аб лябараторыях, аб абсталяваньні аўдыторый можна будзе думаць толькі тады, калі прыедуць студэнты...

Ня гледзячы на такое вырашэньне пытаньня ў Наркамасьветы, работнікі політэхнічнага інстытуту прыступілі да закупкі прыклад для лябараторый і габінэтаў і да загатоўкі неабходнай мэблі для аўдыторый.

Пастановы СНК аб прадастаўленьні [illegible] ВТНУ [illegible] не абскардзіў і ў той-жа час яе ня выконвае. Свабодных памяшканьняў у будынках БДУ ёсьць даволі. Чым-жа вытлумачыць такія адносіны Наркамасьветы да справы арганізацыі ВТНУ?

Падрыхтоўчая работа да парматальнай арганізацыі навучальнага году ўжо напалову сарвана.

Як.

З лістоў рабселькораў

АДЗІН З ПЕРШЫХ

Калгас «Чырвонае Палесьсе», **Пятрыкоўскага** раёну (Мазырщчына), сяўбу скончыў раней вызначанага тэрміну. Зараз пачала работу кузьня па рамонце сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару да ўборкі ўраджаю. Вытворчая нарада калгасу прыступіла да распрацоўкі пляну ўборачнай кампаніі.

Рабкор.

БЕЛСЕЛЬТРЭСТ ЗАБЫЎСЯ АБ ПРАКТЫКАНТАХ

Усім вядома якое месца займае вытворчая практыка студэнтаў у сыстэме прадрыхтоўкі кадраў спэцыялістых. Тут мы падамо, як праходзіць вытворчая практыка студэнтаў с.-г. акадэміі ў саўгасах. Белсельтрэст ня выказвае да гэтага пытаньня ніякай больш-менш сур'ёзнай увагі. Калі студэнты прыехалі ў Межаўскі саўгас, дык даведаліся, што Белсельтрэст абмежаваўся толькі паведамленьнем аб тым, што вось у вас будуць студэнты на практыцы. Колькі практыкантаў будзе, як іх разьмеркаваць і г. д. аб гэтым Белсельтрэст не паклапаціўся. І ня дзіва, што кіраўнікі саўгасу Межава алмовіліся выдаць практыкантам спэцвопратку, а аплату практыкантаў вызначылі—25 руб. У той час, як ёсьць зусім выразная пастанова Наркампрацы, што студэнты-практыканты першага ці другога курсу атрымліваюць 1 р. 50 кап. у дзень. Загадчык саўгасу спасылаецца на тое, што такія паказаньні ён атрымаў ад упоўнаважанага Белсельтрэсту т. Рака. Ці так гэта, ці не, але у саўгасе Межава практыкантаў сустрэлі з вялікай неахвотай. Цікава, што думаюць кіраўнікі Белсельтрэсту аб практычнай падрыхтоўцы кадраў для сацыялістычнага земляробства.

Гопад Б.

КУРСЫ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

Пры Мар'іна-Горскім с.-г. тэхнікуме 1-га красавіка арганізаваны 8-мімесячныя курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікум. Трэба сказаць, што арганізацыя курсаў стаіць пад пагрозай. Папершае, адсутнічае ўвага адпаведных органаў да сацыяльнага адбору курсантаў. 70 проц. заяў прыпалае выключна па Пухавіцкі раён, пры чым большая частка курсантаў— вучні сяміголак. Процант рабочых, батракоў і беднаты сярод падаўшых заявы зусім нязначны. Дрэнна з матар'яльным забесьпячэньнем рабоча-бядняцкай часткі слухачоў.

Курсы патрабуюць да сябе ўвагі органаў НКА

Ю.

САМАКРЫТЫКА НЕ Ў ПАШАНЕ

Пры **Рагачоўскім** пэдтэхнікуме ёсьць дасьледча-практыкавальная школа-сямігодка. Загадчыкам яе зьяўляецца Лябецкі. Асноўная рыса нашага загадчыка— гэта ігнараваньне самакрытыкі вучняў і іх бацькоў. Лябецкі трымае школу на ўзроўні маралі старое гімназіі. Сказаць што-небудзь пра яго недахопы— значыць, зрабіць вялікі непаразуменьні грэх. Вось некалькі фактаў: бацьком вучня Хасіна давялося сказаць нешта такое самакрытычнае загадчыку Лябецкаму. Лябецкі адказаў на гэта тым, што пазбавіў Хасіна мануфактуры, перадаўшы яе тым, хто маўчыць. Але вось больш выразны выпадак з вучнем-батраком Ермаковым. Лябецкі і настаўніца Галіпенка прымусілі Ермакова пакінуць школу, пазбавіўшы яго ўсякай дапамогі.

Батрак Ермакоў пакінуў школу і пашоў на заработкі.

А Лябецкі, што выжывае са школы вучняў-батракоў, застаўся на месцы.

Я. КРУШЫНА.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

— Фрунзаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што 27-га мая 1930 г., роўна а 7-й гадз. увечары, у памяшканьні клюбу Працасьветы склікаецца 1-я група раённага дэлегацкага сходу.

У гэты самы дзень і час скліканецца 3-я група ў памяшканьні клюбу саўгандальспужачых.

Яўка дэлегатак абавязкова і без спазьненьня.

ФРК КП(б)Б.

Дом Асьветы. У 19 гадз. — агульны сход асьветнікаў г. Менску. На парадку дня даклад НКАсьветы аб працы ў зьвязку з надыходзячай чысткай апарату НКА.

Да ведама членаў саюзу працасьветы. З 1 чэрвеня пры Доме Асьветы адкрываецца дзіцячая пляцоўка для дзяцей чл. саюзу працасьветы. Апошні тэрмін падачы заяў у Дом Асьветы—28 мая.

Мен. АК МОПР'у. Пасядж. прэзыдыуму. Парадак дня: 1. Інфарм. аб пленумах райкомаў МОПР'у. 2. Аб работе сярод сэзоньнікаў. Пач. у 19 гадз. Яўка чл. і канд. АК і гар. РК абавязкова Запраш. прадст. сэзон. рабачкомаў і актыў МОПР'у.

Нарада францыў праўленьняў жакт'аў — 7, 10, 11, 19, 16, 20 і 21 і пасёлку «Каміцтэрн». Пач. у 16 г. у будынку Кастр. РК КП(б)Б.

Сад Асьветы. Кіно — «Юда». Пач у 21 гадз. Білеты ў касе саду ад 19 гадз.

Пэдфак (фіз. аўд.). У 18 гадз. 15 м. заняткі антыраліг. ун-ту. Яўка слухачоў абавязкова.

ЗАЎТРА:

ЖАКТ № 4. (Савецкая. 97) Нарада камуністых жыхароў ЖАКТ'у № 4 у 19 гадз.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА:

Дом Камасьветы. У 19 гадз. пакой № 19, — групавая кансультацыя тав. Лур'е аб тэзісах па калгасным руху для дакладчыкаў, вылучаных Фрунзаўскім і Кастрычніцкім РК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Сёньня 27 мая, роўна а 7 гадз. ўвеч. прызначаецца збор атраду і разэрву імя Блюхера. Абдудуцца практычныя заняткі на мясцовасьці.

КІРАЎН. АТРАДУ.

Сёньня, 27 мая а 8 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу саўгандальслужачых склікаецца НАРАДА ПРАФАКТЫВУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ гор Менску. У парадку дня — аб правядзеньні перавыбарчай кампаніі МК і аб далейшай рабоце саюзу. Яўка ўсяго прафактыву абавязкова без спазьненьня.

Запрашаюцца ўсе члены саюзу.

ЦП САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ паведамляе, што з 27 мая а 7 гадз. дня ў памяшканьні БДУ (фізычны інстытут) пачынаюць працаваці КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ Ў БДУ І ТЭХНІКУМЫ.

Аб выніках заяў аб запічэньні на курсы даведацца ў ЦП саюзу ў т. Кайкава або Тапырына.

Усе таварышы запічаныя на гэтыя курсы павінны зьявіцца на заняткі ў паказаны час без спазьненьня.

Сёньня, 27 мая а 7 гадз. увечары ў памяшканьні Кастрычн. РК КП(б)Б

— адбудзецца —

НАРАДА ЖАНОЧАЙ СЭКЦЫІ КАСТРЫЧНІЦКАГА РАЙКОМУ МОПР'У.

Яўка членаў сэкцыі абавязкова.

Запрашаецца мопрўскі актыў жактаўскіх і школьных ячэек.

РК МОПРУ'у.

---

27 МАЯ

УСЕ НА КНІЖНЫ РЫНАК

Сёньня, 27-га мая АПОШНІ ДЗЕНЬ

КНІЖНАГА РЫНКУ

Іграе аркестр МУЗЫКІ, ЦІКАВЫЯ АТРАКЦЫЁНЫ.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ.

СКІДКА ад 10% да 25%

Кніжны рынак арганізаваны БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВАМ, ГІЗ'ам РСФСР і іншымі кнігагандлюючымі арганізацыямі ў ГАРАДЗКІМ СКВЭРЫ (каля Белдзяржтэатру).

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — Сёньня, 27 мая для саюзу ХАРЧАВІКОЎ — Пачатак а 8 з пал. гадз. увечары

Спэктаклі мастацкага ансамблю „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ" „РЫЧИ, КИТАЙ"

КІНО-ТЭАТР Культура — Мастацкі фільм у 7 частках СЭКТАНТЫ — Звыш праграмы кіно-часопіс Саўкіно № 25 — Пачатак роўна а 7 г. — Каса ад 5 гадз.

КІНО Пятырвацьцяна — Амэрыканскі мастацкі фільм 1.000 КОНСКІХ СІЛ (Бура ў Каліфорніі) — Звыш праграмы: КУЛЬТУРФІЛЬМ — Вытворчасьць электрычн. лямпачак — Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч. і Каса ад 5 г.

КІНО САД (Савецкая. 71) — ПАТ І ПАТАШОН у новай камэдыі ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ кам. у 7 частках — Звыш праграмы хроніка САЎКІНО № 24 — Пачатак 1-га сэансу а 9 гадз. — Каса з 6 г.

КІНО Пралетары — ТРУКАВЫ КІНО-РАМАН МІС МЭНД — 2 сэрыі—11 частак у адзін сэанс у галоўнай ролі Ігар Ільінскі — Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. — Каса з 5 гадз. — КУЛЬТУРФІЛЬМ ТУРКСІБ у 5-ці частк. — Звыш праграмы хроніка „САВКІНО" — Пачатак 1 сэансу а 2 гадз. дня. Каса з 12 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"

Кіно „СПАРТАК" — З панядзелка, 26 мая — НЯМЕЦКІ БАЯВІК — ЖЫЦЬЦЁ за ЖЫЦЬЦЁ — драма ў 10 частях. У галоўн. ролях: Пауль В ГНЭР, Пауль РЫХТЭР, Марцэля АЛЬБАНІ — УВАГА! УВАГА! З прычыны працягнасьці карціны. Пачатак 1 с.—6 г., 2 с.—8 г. 30 м., 3 с.—11 ч. Каса—з 5 гадз.

Менскі Дзяржсоўны Музычны Тэхнікум абвяшчае прыём заяў на 1930-31 навучальны год на усіх аддзелах: 1) інструктарска-пэдагагічнага, 2) вакальнага, 3) струнных інструмэнтаў, 4) духавых інструмэнтаў, 5) фартэпіннага.

На 1-шы курс тэхнікуму прымаюцца з ведамі ў абёме праграмы музычнае школы па спэцыяльным прадмеце, тэорыі музыкі, пачатковага сальфэджыо, абавязковым раялі і палітграмаце.

На падрыхтоўчыя курсы тэхнікуму прымаюцца выключна рабочыя, калгасьнікі, сялянe-бедняки, серадняки і іх дзеці без музычнае падрыхтоўкі.

Прыём заяў адбудзецца з 1 чэрвеня па 10 жніўня. Правілы прыёму можна атрымаць ва ўсіх аддзелах АкрІНА і раёнах. Адрас музтэхнікуму: Університэцкая, 45.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на курсы па падрыхтоўцы ў Мар'іна-Горскі Садова-Гародны тэхнікум ПРАЦЯГНУТ ДА 5 чэрвеня г. г.

На курсы прымаюцца рабочыя, батракі, бедняки, калгасьнікі, якія маюць падрыхтоўку за пяць клясаў сямігодкі. Заявы і дакументы (пасьведчаньне аб асьвеце; мэтрыка і даведка аб сацстановішчы) накіроўваць па адрасе: ст. Пухавічы, Зах. чыг., Мар'іна-Горскаму, Садова-Гародняму тэхнікуму.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяцеце па тэл. 2-49

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: мягким золот., серебр., маслян., рельефн анилин. не расплыв. красками. Бисерн., жемчужн. и мерцающ. пеpесыпками. Роспись по сосудам, стеклу, целлоиду, коже и дереву. Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Уменьше рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мел. мар.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО. МОСКВА, ул. Дзержинского, д. 1.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ ў Віцебску ў цэнтры гораду (Канатная вул., № 49) на кватэру ў Менску. Даведацца па адрасе: Рэвалюцыйная вул., № 6, Інтэрнат, пакой № 7, тав. Крусанаву.

Курсанты рахунковых курсаў на будаўніцтве пры Наркампрацы БССР прыносяць падзяку настаўнікам бухгальтэрыі т.т. І. Саламонаву і Лазінскаму за пасьпяховае, умелае тэарытычнае і практычнае выкладаньне на курсах.

Група курсантаў.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Вуч.-конск. кн. Бронцава А. С., выд. Чавуск РВК. 371

Вуч.-конск. кн. № 676 Аўтуховіча І. І., выд. Бярэзінск. РВК. 372

Паяв. кн. Семеняка З. Д., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам. 373

Віза Стэльмаха П. Л., выд. Вітуніцкім с.-с. 374

Вуч.-конск. кн. № 148 Гаўрыловіча П. П., выд. Бягомльск. РВК. 375

Вайск. біл. № 3618 Курбацкага Я. А., выд. Лепельск. РВК. 376

Пашп. Сямёнава Ф. Я., выд. Сакалішчанск. с.-с. 377

Паяв. кн. № 332 Коршуна Д., выд. Клясьніцк. спаж. т-вам. 378

Чл. біл. саюзу СГПР № 6367 Піскуна А. А. 379

Паяв. кн. № 1738 Топік З. В., выд. Бягомльск. спаж. т-вам. 380

Віза Зімніцкай Ю., выд. Вітуніцкім с.-с. 381

Вуч.-конск. кн. № 184 Асіповіча С. Я., выд. Бягомльск. РВК. 382

Чл. біл., выд. Бягомльск. РГК., мэтр. пасьведч. № 518, выд. Лепельск РВК на імя Зобіна Б. 383

Вайск. біл. Шулякоўскага Я., выд. Барысаўск. ваенкаматам. 384

Каап. кн. № 2486 Грамовіча І., выд. Узьдзенск. спаж. т-вам. 385

Канд. карт. № 36127 Аліферовіча А. М., выд. Маз. АК КП(б)Б. 386

Вуч.-конск. кн. № 2385 Бельковіча П. 387

Асабов. кн. № 200 Шыфрына Х. М., выд. Талачынскім РВК. 388

Каап кн. № 898 Чухінскага Н. С., выд. Нараўлянск. спаж. т-вам. 389

Вайск. біл. Клёўка М. Д., выд. Пухавіцк. РВК. 390

Даведка № 1473 Мураіча К., выд. Заслаўск. спаж. т-вам 391

Вайск. біл. № 4186 Чэрнуха Г. С. 392

Асаб. кн. № 1927 Цыбульскага Ф. І., выд. Бярэзінск. РВК. 393

Вайск. кн. № 4276 Савановіча У. І выд. Капыльск. РВК. 394

Чл. біл. саюзу будаўнікоў, вайск. кн пашп., выд. Талачынск. РВК на ім. Эйдэльмана Э. 395

Асаб. кн., вуч.-конск. карт. Касьцюкевіча П. І., выд. Заслаўск. РВК. 396

Віза № 193 Сенькевіча У. М., выд Анусінскім с.-с. 397

Вуч.-конск. кн. Залівако З., выд. Асатраш-Гарадзецк. РВК. 398

Каап. кн. № 2203 Райкевіча П. Ф. выд. Барысаўск. спаж. т-вам. 399

Каап. кн. № 18777 Майоровіча С. Д выд. Узьдзенск. спаж. т-вам. 400

Вайск. пасьведч. Сушко П. Я., выд. Барысаўск. прыз. камісіяй. 401

Асаб. кн. Дылейко Ф., выд. Бярэзінск РВК. 402

Вуч.-конск. кн. № 6654 Сакова А. Г 403

Вуч.-конск. кн. № 1901 Буліча І., выд Бярэзінск. РВК. 404

Каап. кн. № 729 Вайніштэйн Р., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам. 405

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.